Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ВЕРАСНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 169 (29283)

Дарагія сябры!

## ВІНШУЮ ВАС З ДНЁМ ВЕДАЎ!

*Гэта свята штогод прыносіць у жыццё кожнага чалавека самыя добрыя ўспаміны і моцныя эмоцыі.*

*Гэта настальгічны смутак па дзіцячых і юнацкіх гадах, якія ўжо ніколі не паўторацца. Хваляванне першакласнікаў, якія робяць першыя крокі па дарозе ведаў, першакурснікаў, якія ўсвядомлена выбралі свой прафесійны шлях. Перажыванні бацькоў, якія разам з дзіцем нібыта самі ідуць у першы клас і разам з ім праходзяць розныя перыяды яго вучобы. Натхненне маладых настаўнікаў і выкладчыкаў перад першым у сваёй педагагічнай дзейнасці ўрокам або лекцыяй. І, вядома, радасць ад будучай сустрэчы ўсіх, хто за час канікулаў засумаваў па вучэбных буднях.*

*Няхай для ўсіх навучэнцаў і настаўнікаў новы навучальны год будзе цікавы, напоўнены яркімі падзеямі.*

*Настаўнікам жадаю невычэрпнай энергіі і плённай працы. Бацькам — уключанасці ў адукацыйны працэс і мноства падстаў для гонару за сваіх дзяцей. Вучням і студэнтам — натхнення і імкнення да ведаў, якія стануць галоўнай умовай поспеху і дабрабыту ў іх будучым жыцці.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр Лукашэнка.**

# ТРЫ ПАКАЛЕННІ ШКОЛЬНІКАЎ



Вёска Дрэбск Лунінецкага раёна. Шасцігадовы Мацвей МАРОШКА збіраецца ў школу. А вучыцца ён будзе ў Дрэбскіх яслях-садзе — пачатковай школе. Акрамя Мацвея, у адзіным на ўсю школу першым класе сядуць за парты яшчэ сем вучняў. Сабраць школьны ранец хлопчыку дапамагаюць матуля Надзея Фёдараўна і бабуля Ева Андрэеўна. Кніжкі і сшыткі, алоўкі і ручкі, а таксама іншыя прыналежнасці, як і сам ранец, былі куплены яшчэ на пачатку лета, а вось урачысты гарнітур — нядаўна, і ў самой сталіцы. Дарэчы, Мацвей — трэці ўнук бабулі Евы, і да таго ж самы малодшы. Матуля і бабуля, як і Мацвей, нарадзіліся ў Дрэбску і пайшлі ў Дрэбскую пачатковую школу — Надзея ў 1990 годзе, а Ева Андрэеўна ў 1956-м.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі:**

*«Школы павінны быць па-за палітыкай, дзеці мусяць вучыцца і атрымліваць адукацыю. Падзелу ў школах быць не павінна. 1 верасня — Дзень ведаў. Думаю, усе са святочным настроем прыйдуць у гэты дзень у школы, сядуць за парты, а бацькі і педагогі зробяць усё, каб стварыць атмасферу свята дзецям».*

## КАРАТКА

- **Беларусь з 1 верасня павышае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.**
- БДУ палепшыў пазіцыі ў Маскоўскім міжнародным рэйтынгу «Тры місіі універсітэта».



- **Зімовая Універсіяда, якая павінна была прайсці з 21 да 31 студзеня 2021 года ў швейцарскім Люцэрне, перанесена з-за пандэміі COVID-19.**
- Беларусь і Узбекістан маюць намер аднавіць рэгулярныя авіярэйсы.
- **ЦЭЦ Добрушскай папяровай фабрыкі плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў снежні.**
- Будпрадпрыемствы Беларусі будуць праводзіць прамыя тэлефонныя лініі з насельніцтвам пастаянна.

Экспертная пляцоўка

## «ПА СВАЁЙ ПРЫРОДЗЕ ЦАРКВА СТАІЦЬ НАД СУТЫЧКАМІ І АКОПАМІ»

**Падзеі гэтага лета закранулі ўсе сферы жыцця, не пакінулі яны ўбаку і рэлігійную. Цэрквы здзяйсняюць адмысловыя і сумесныя малітвы, дзеячы розных канфесій і свяшчэннаслужыцелі выступаюць з заявамі, звяртаюцца да дзяржаўных органаў, наведваюць затрыманых і пацярпелых падчас пратэсных акцый, выступаюць у СМІ. Шмат выказванняў і версій з'явілася ў медыя з нагоды змены кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы.**



**У сувязі з гэтым «Звязда» папрасіла начальніка аддзела сацыялагічных даследаванняў Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, кандыдата сацыялагічных навук, дацэнта Святлану АЛЕЙНІКАВУ адказаць на некалькі пытанняў.**

СТАР. 4

Класныя навіны

## У НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД — З НОВЫМІ ШКОЛАМІ

**1 верасня за школьныя парты сядуць 114 тысяч першакласнікаў. Агульная ж колькасць школьнікаў перавысіць 1 мільён 55 тысяч чалавек. Гэта на 25 тысяч больш, чым у папярэднім навучальным годзе. Тэма першага ўрока — «Я вырас тут, і край мне гэты дарагі».**

У 2020-2021 навучальным годзе ў Беларусі будзе функцыянаваць 2990 дзяржаўных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Для падвозу 66 тысяч навучэнцаў задзейнічаюць каля 1,6 тысячы школьных аўтобусаў, у тым ліку 289 спецыяльна абсталяваных для навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Запланавана таксама адкрыццё трох новых сучасных школ. Так, новая ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі прыме вучняў у Віцебску, у мікрараёне Білева. Яе з'яўленне стане доўгачаканай падзеяй для мясцовых жыхароў, якія да гэтага часу былі вымушаныя адпраўляць сваіх дзяцей на вучобу ў іншыя раёны горада. З улікам вострай патрэбы ў школьных месцах 1 верасня парог новай навучальнай установы пераступіць, паводле папярэдніх звестак, каля 1,2 тысячы навучэнцаў, у тым ліку сфарміравана 12 першых класаў. Заняткі будуць арганізаваны ў дзве змены. У школе прадугледжаны спецыяльныя класы для заняткаў музыкай, арганізацыі гуртковай работы, ёсць добрая бібліятэка, дзве абедзенныя залы і вялікая сталоўка. Таксама створана развітая інфраструктура для заняткаў спортам: на прышкольнай тэрыторыі ўзведзены стадыённы комплекс з пляцоўкамі для валейбола, баскетбола, хакейная каробка, футбольнае поле і тэнісны корт.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!
Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «Хацелася б, каб гэтыя перамены рухалі наша грамадства наперад»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Вярхоўнага Суда Валянцінам Сукалам, перадае прэс-служба Прэзідэнта.**

Кіраўнік дзяржавы абмеркаваў тактычныя і стратэгічныя тэмы работы судоў. «Калі гаварыць пра тактыку, то канкрэтныя тэмы, праблемы, аж да крымінальных спраў, якія знаходзяцца на кантролі ў Прэзідэнта. Што датычыцца стратэгіі, цяпер вельмі шмат размоў аб тым, што нам трэба нейкім чынам перабудаваць нашу грамадска-палітычную сістэму, змяніць сітуацыю ў краіне. Перамены, перамены... Праўда, ніхто не гаворыць пра тое, якіх хоча перамен. Але я добра ведаю, хто гэтага хоча, і якія яны хочуць перамены», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Вяртанне да Канстытуцыі 1994 года Прэзідэнт назваў рухам назад, а не наперад. «Гэта ёсць перамены, але гэта не рух наперад. Хацелася б, каб гэтыя перамены рухалі наша грамадства наперад. На такіх пераменах мы будзем настойваць і прапаноўваць нашаму народу такія змяненні», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што спецыялісты працуюць над змяненнямі ў галоўны закон краіны. Затым праект будзе вынесены на абмеркаванне грамадству. «Каб пакруцілі, выказалі сваё меркаванне: што ім падабаецца, не падабаецца... Але пры гэтым хачу сказаць асабліва заўзятым, якія гвалтам крычаць за перамены: яны павінны разумець, што ў кожнага дарослага чалавека пры галасаванні за тое ці іншае пытанне на рэферэндуме па Канстытуцыі ёсць адзін голас — і ў вяскоўцаў, і ў рабочых, настаўнікаў, урачоў, спецыялістаў, і ў тых, хто дасягнуў 18-гадовага ўзросту і сёння бадзяецца па вуліцах спакойнага, чыстага, утульнага Мінска», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Галасы непаўналетніх, якіх нямала на мітынгах, улічваюцца не могуць.

Прэзідэнт канстатаваў, што ідзе работа над трэцім варыянтам Канстытуцыі Беларусі, і папрасіў старшыню Вярхоўнага Суда падключыцца да яе.

Выказаўся кіраўнік краіны і наконт работы суддзяў: «Многія хочуць — і ў самой судзейскай супольнасці — нейкай незалежнасці. Хоць я гатовы з кім хочаце спрачацца, што самы незалежны суд — у Беларусі. Няхай ніхто не смяецца. Вы ж ведаеце, наколькі я засцерагаю вас ад розных накатаў або тэлефонных просьбаў і размоў. Я часта кажу, што ўсё залежыць ад суддзяў: калі яны хочуць быць ад некага залежнымі, значыць, яны будуць адказваць, вобразна кажучы, на гэтыя званкі. Вы ніколі ад мяне таемна не атрымлівалі ніводнага званка, у нас усё адкрыта. Калі Прэзідэнт кантралюе якую-небудзь крымінальную справу, я пра гэта адкрыта кажу, і вы таксама».

Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што, нягледзячы на тое што ў нас крыху аўтарытарная сістэма ўладкавання грамадскага жыцця, Прэзідэнт аберагае і ахоўвае суды. На яго думку, трэба зрабіць так, каб «працавала сістэма, не завязаная на асобе, у тым ліку Лукашэнку». «Таму, я думаю, у новай Канстытуцыі мы дастойна адлюструем сістэму ўладкавання нашых судоў, зыходзячы з нашага з вамі вопыту работы за апошнюю чвэрць стагоддзя. Але адказна: уносіце прапанову — распішыцеся за гэтую прапанову», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

* * *

Учора Прэзідэнт таксама падпісаў распараджэнне «Аб запуску навукова-адукацыйнага спадарожніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». Міністэрству адукацыі даручаецца ў 2020-2021 гадах забяспечыць запуск спадарожніка БДУ, а таксама прадугледжваюцца крыніцы фінансавання расходаў на праект. «Усе работы па распрацоўцы і вырабе другога спадарожніка БДУ выкананы супрацоўнікамі, студэнтамі і аспірантамі ўніверсітэта. У параўнанні з эксплуатуемым цяпер спадарожнікам ён мае вялікі патэнцыял для правядзення касмафізічных эксперыментаў з выкарыстаннем айчынных матэрыялаў і паўправадніковых прылад», — паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Планавы час запуску спадарожніка — 2021 год. На арбіце будзе сфарміравана першая беларуская групоўка з двух навукова-адукацыйных спадарожнікаў для адпрацоўкі іх узаемадзеяння і каардынацыі.

Як дадае прэс-служба, распараджэнне накіравана на папулярызацыю аэракасмічнай галіны, павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і развіццё айчыннай навуковай школы гэтага профілю, а таксама прыцягненне таленавітай моладзі для распрацоўкі навукаёмістых тэхналогій.

Меркаванне

# «Няхай паспрабуюць, але гэта проста «дзвіжуха»

**Генадзь ДАВЫДЗЬКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, пракаментаваў карэспандэнту «Звязды» сваю пазіцыю наконт ініцыятывы адклікання дэпутатаў, змены кіраўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы і ролі святароў у палітычных падзеях.**



Фота БелТА.

***— Генадзь Браніслававіч, ці ўсхвалявала дэпутатаў ідэя іх адклікання, якая набірае прыхільнікаў у сацсетках?***

— Я думаю, што дэпутатам нельга хвалявацца, бо гэта штучная падзея. Каманда зусім іншай краіны, з Польшчы (інтэрнэт-рэсурс, які кіруе смутай, што зараз у нашай радзіме) закамандавала вось гэта. Людзі, якія сёння адклікаюць дэпутатаў, як правіла, тыя, якія ўвогуле не ўдзельнічалі ў парламенцкіх выбарах. А калі і ўдзельнічалі, не абіралі гэтых дэпутатаў. Людзьмі, больш таго, маніпулююць, укідваючы фэйкі, лухту наконт поўнай злачыннасці, поўнай немагчымасці ўлад кіраваць, у тым ліку заканадаўцаў: «Давайце будзем іх штурхаць!» Працэдура законная, няхай яна пойдзе, няхай адклікаюць. Але неабходна ў выніку сабраць ажно 20 працэнтаў галасоў сярод выбаршчыкаў. Я ўпэўнены, што тыя, хто правакуе такі недавер да ўлад, хто выходзіць на плошчы і вуліцы, — гэта меншасць. Здаецца, што іх большасць, бо яны тыражуюць сябе, ім вельмі дапамагае Захад. Няхай паспрабуюць, але гэта проста «дзвіжуха». Потым ім падкажуць нешта яшчэ, калі гэтая ініцыятыва скончыцца ці не атрымаецца.

***— Ці павінна і ці можа царква заставацца ўбаку ад палітычных працэсаў у грамадстве?***

— Царква — гэта тэрыторыя духоўнасці, маральнасці. Што датычыцца палітыкі: нават самыя актыўныя ўдзельнікі палітычных падзей не да канца разумеюць, на чыю карысць яны працуюць. Заўсёды рэвалюцыі — гэта разбурэнне. Тут мне хочацца прывесці словы Максіміліяна Валошына, якія пісаў у часы грамадзянскай вайны: «И всеми силами своими молюсь за тех и за других».

Мне здаецца, што менавіта такую пазіцыю павінна займаць царква — маліцца за душы гэтых і тых, якія ў падмане існуюць, шукаюць выйсце. Палітычнымі справамі няхай займаюцца палітыкі.

Чалавек павінен разумець, што ёсць дабро, а што зло. І вельмі часта зло маскіруецца пад дабро, часам дабро выглядае як зло. Калі бацька не дае сыну пабегчы на дарогу і рэзка яго адштурхоўвае, можна сказаць, што ён жорсткі. Але бацька бачыў, што па дарозе рухаецца машына, і ўратаваў ад смерці сваё дзіця, а яно гэтага не ведае. А малое думае, што бацька такі ўжо жорсткі...

У дадзеным выпадку палітыка вельмі тонкая справа, разабрацца простаму чалавеку ў тым, што адбываецца, вельмі цяжка. Таму грамадства павінна чуць адно аднаго, прыслухоўвацца. Тыя, хто лічаць сябе апазіцыянерамі, не надта прымаюць тых, хто лічаць сябе дзяржаўнікамі. Яны адразу ставяць крыж, кажучы, што іншыя дурныя. Тое ж самае робяць і дзяржаўнікі, сцвярджаючы: «Яны бузяць, нечага хочуць». Вось тут трэба знайсці паразуменне. А царква — гэта месца зусім іншае, дзе трэба супакоіцца і зразумець велізарную каштоўнасць душы. Калі на пропаведзі святар пачынае сцвярджаць палітычныя прынцыпы, а не маральныя, ён у гэты момант, на мой погляд, перастае быць духоўнікам.

***— Як вы ацэньваеце нядаўнюю змену кіраўніцтва БПЦ? На ваш погляд, ці ёсць тут нейкія палітычныя падставы?***

— Мне б не хацелася нават шукаць там палітычных нагод. Я добра ведаю ўладыку Веніяміна, добра ведаю ўладыку Паўла. Я ведаю: не зусім простыя ўзаемаадносіны ў «чыноўнікаў» ад царквы (яны ж людзі, хоць і слугі Божыя), там былі інтрыгі. Мітрапаліт Павел не зусім, я думаю, увайшоў у беларускую сітуацыю. І, можа, не ўсё зрабіў, што мог, таму было прынятае такое рашэнне. Паглядзім, мне вельмі цяжка тут каментаваць, але палітыкі тут не бачу.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

**У мінулы чацвер у Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы Генадзь Давыдзька правёў сустрэчу з выбаршчыкамі сталічнай Усходняй акругі № 107. На прыём да дэпутата сабралася цэлая зала. Сустрэча была, як сведчаць розныя крыніцы, дастаткова гарачая. Людзі прыйшлі, каб задаць розныя, часам досыць «гарачыя» пытанні.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трамп упэўнены, што спыніць гвалт у гарадах можна толькі сілай



Пра гэта прэзідэнт ЗША Дональд Трамп напісаў у сваім «твітары». Ён абвінавуціў мэра Портленда, дзе ідуць акцыі пратэсту, у такой сітуацыі. «Тэд Уілер, дзіўны радыкальны левы, нічога не прадпрымае, назірае вялікае знішчэнне і разбурэнне свайго горада падчас знаходжання на пасадзе», — адзначыў прэзідэнт ЗША. Паводле яго слоў, «жыхары Портленда, як і ўсіх іншых гарадоў і частак нашай вялікай краіны, хочуць закона і парадку», але такія мэры-дэмакраты, як кіраўнік Портленда, ніколі не змогуць гэтага зрабіць. Дональд Трамп таксама настойвае на ўводзе ў горад Нацыянальнай гвардыі. Мясцовыя ўлады адмаўляюцца ад гэтай прапановы. Ранейшы выканаўца абавязкаў кіраўніка Міністэрства ўнутранай бяспекі (МУБ) ЗША Чэд Вулф заявіў, што ў Портлендзе пануюць «хаос і беззаконне». Ён таксама падкрэсліў, што МУБ гатова выкарыстаць усе рэсурсы для нармалізацыі становішча ў горадзе, дзе акцыі пратэсту і беспарадкі працягваюцца больш за 90 дзён. У ноч на нядзелю паліцыя паведаміла, што ў Портлендзе быў смяротна паранены чалавек пасля сутыкненняў паміж пратэстуючымі з руху Black Lives Matter і прыхільнікамі Трампа.

### Сталі вядомыя прэтэндэнты на пасаду прэм'ера Японіі

Генеральны сакратар Кабінета міністраў Японіі Ёсіхідэ Суга вырашыў пазмагацца за пасаду прэм'ер-міністра пасля таго, як дзеючы кіраўнік японскага ўрада Сіндзо Абэ абвясціў пра намер пайсці ў адстаўку. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва Kyodo. Паводле яго звестак, Суга возьме ўдзел у выбарах кіраўніка кіруючай Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП), запланаваных на 15 верасня. Kyodo адзначае, што шэраг высокапастаўленых членаў ЛДП хваляць яго навыкі крызіснага кіравання і заяўляюць, што важна падтрымліваць пераемнасць палітыкі для барацьбы з каранавірусам. Акрамя таго, пра намер пазмагацца за пасаду прэм'ер-міністра Японіі заявілі былы міністр замежных спраў Фуміа Кісіда і колішні міністр абароны Сігэру Ісіба. Сіндзо Абэ адзначыў, што працягне выконваць абавязкі кіраўніка ўрада, пакуль яму не абяруць пераемніка.



### Астэроід памерам са шматпавярховік праляціць сёння паблізу Зямлі



Астэроід 2011 ES4 дыяметрам ад 22 да 49 метраў праляціць 1 верасня блізу Зямлі з хуткасцю 8,16 кіламетра ў секунду, паведамляецца на сайце НАСА. Па звестках агенцтва, астэроід найбольш наблізіцца да Зямлі ў 16.12 па сусветным часе UTC (19.12 па мінскім). Мінімальная адлегласць ад Зямлі складзе 121 тысячу кіламетраў — гэта ўтрая менш, чым да Месяца (384 тысячы кіламетраў). Наступны раз на такую адлегласць да Зямлі наблізіцца астэроід 2008 DB, прычым адбудзецца гэта толькі ў 2032 годзе, адзначыла Business Insider. Выданне падкрэсліла, што 2011 ES4 не ўяўляе небяспекі для нашай планеты. Нават калі б траекторыя яго палёту перасякалася з зямной, дзякуючы сваім адносна невялікім габарытам гэты астэроід згарэў бы ў атмасферы падчас падзення. 2011 ES4 быў адкрыты ў 2011 годзе. Ён адносіцца да групы апалонаў — астэроідаў, чые арбіты перасякаюць арбіту Зямлі з вонкавага боку. У жніўні міма нашай планеты праляцеў больш буйны астэроід 2009 PQ1. Яго дыяметр супастаўны з памерамі футбольнага поля.

Падзея

# Беларускія спартсмены за мір і стабільнасць



**Апошнія выхадныя лета выдаліся актыўныя. У межах акцыі ў падтрымку міру і стабільнасці быў праведзены ў Мінску сапраўдны маладзёжна-спартыўны фестываль — аўта- і велапрабегі, марш коннікаў, заплывы на байдарках.**

Актывісты БРСМ падтрымалі ідэю захавання міру і стабільнасці ў краіне сімвалічным велапрабегам. Старт быў дадзены каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а скончыўся прабег на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Усяго актывісты праехалі каля 15 кіламетраў.

У велапрабегу «За Беларусь» прынялі ўдзел і прадстаўнікі спорту. На роварах па вуліцах сталіцы праехалі першы віцэ-прэзідэнт НАК Віктар Лукашэнка, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, старшыня АБФФ Уладзімір Базанаў, старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Уладзімір Рыжанкоў, кіраўнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінскгарвыканкама Міхаіл Пракапенка. Прыняў удзел і віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка. Кампанію кіраўнікам галіны склалі чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў Аляксандр Багдановіч, Наталля Цылінская, Настасся Пракапенка, паралімпіец Аляксей Талай.

***«Моладзь, людзі, якія любяць і цэняць спорт, займаюцца ім, сёння выйшлі, каб паказаць сваю павагу да нашых дзяржаўных сімвалаў, да нашай краіны.*** Напярэдадні дня ведаў мы правялі выдатнае свята з удзелам моладзі, якая накіравана ўперад, у спакойную светлую будучыню. Мы будзем практыкаваць такую папулярызацыю спорту і здаровага ладу жыцця. Так мы дэманструем сваю згуртаванасць і любоў да роднай краіны, якую жадаем бачыць спакойнай і прыгожай, дзеля шчаслівага і мірнага жыцця нашых дзяцей», — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Заезд стартаваў з розных пунктаў сталіцы — ад стэлы «Мінск — горад-герой», Камсамольскага возера, будынка футбольнага клуба «Мінск», штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Палаца тэніса. Удзельнікі прабегу сустрэліся на пляцоўцы каля «Мінск-Арэны», дзе падзяліліся сваімі ўражаннямі і пазітыўнымі эмоцыямі.

***«Наш асноўны пасыл — мір, дружба і спорт, які аб'ядноўвае ўсіх. Спартсмены, людзі, якія праслаўляюць краіну, сёння павінны аб'яднаць наша грамадства.*** Такія мерапрыемствы трэба праводзіць часцей і прыцягваць да іх як мага больш моладзі, за якой наша будучыня», — падкрэсліў Сяргей Кавальчук.

Кульмінацыяй мерапрыемства стала выступленне парашутыстаў ДТСААФ, якія разгарнулі ў небе над «Мінск-Арэнай» вялікі Дзяржаўны сцяг.

«Я думаю, беларусы знойдуць пункты апоры, на якіх у нашай краіне трымаецца мір, спакой, магчымасць развівацца. Сінэргія чалавечых душ на гэтым мерапрыемстве надае мне ўпэўненасці, што ўсё будзе добра. Беларусы — вельмі мудрыя і моцныя людзі», — падзяліўся ўражаннямі параалімпіец Аляксей Талай.

Адначасова з велапрабегам у Мінску адбыліся ***заплыў на байдарках і каноэ і марш коннікаў.*** Мерапрыемствы сабралі мноства гледачоў, якіх зацікавіла спартыўнае відовішча. А ад паркоўкі каля аквапарку «Лебядзіны» стартаваў аўтапрабег у падтрымку міра і стабільнасці. Упрыгожаныя нацыянальнай сімволікай аўтамабілі праехалі па Мінскай кальцавой аўтадарозе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота: НАК Беларусі.**

## Па залатым коле Міншчыны

**29 жніўня ад мемарыяльнага комплексу «Курган Славы» стартаваў аўтапрабег «За моцную і квітнеючую Беларусь».**



Фота БелТА.

Маршрут пралёг па другой Мінскай кальцавой дарозе, якая праходзіць па тэрыторыі Чэрвеньскага, Пухавіцкага, Дзяржынскага, Стаўбцоўскага, Уздзенскага, Валожынскага і Маладзечанскага раёнаў. Удзельнікі акцыі праехалі 180 кіламетраў па так званым «залатым кольцы Міншчыны». Паступова дарогай да калоны далучаліся іншыя аўтамабілісты. У выніку да фінішу прыбыло больш за тысячу машын.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ЗА ўласны погляд!

**Мітынг у падтрымку міру, бяспекі і спакою прайшоў каля сцен пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Мінску.**

Рабочая моладзь, актывісты БРСМ, нават звычайныя мінакі, што праходзілі па сваіх справах, далучыліся да акцыі, якая прайшла ў сталіцы 31 жніўня перад будынкам пасольства Літвы ў падтрымку ўласнага пункту гледжання, палітыкі сваёй краіны без умяшання з боку суседніх дзяржаў у яе ўнутраныя справы. Па паведамленнях відавочцаў, з дзяржаўнай сімволікай і плакатамі тут сабралася больш за сто чалавек. Акцыя доўжылася амаль гадзіну, пасля чаго ўдзельнікі мітынгу разышліся.



Фота БелТА.

Асцярожна, ашуканцы!

## ПАЧАСЦІЛІСЯ ВЫПАДКІ ВІШЫНГ-НАПАДАЎ

**Як перадае прэс-служба найбуйнейшага банка краіны, у другой палове жніўня пачасціліся выпадкі вішынг-нападаў у дачыненні да кліентаў «Беларусбанка». У гэты час зламыснікі актыўна спрабавалі атрымаць персанальную інфармацыю ўладальнікаў плацежных картак, выдаючы сябе за работнікаў банка і спецыялістаў іншых арганізацый.**

Як вядома, ашуканцы выклікаюць абанентаў з нумароў, што пачынаюцца на +370, +371, +372, +376. Як правіла, аферысты прадстаўляюцца супрацоўнікамі «Беларусбанка», напрыклад, са службы бяспекі або фінансавага маніторынгу, радзей тэлефануюць пад выглядам работнікаў ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» або Асацыяцыі беларускіх банкаў. Пад рознымі падставамі яны спрабуюць атрымаць звесткі аб рэквізітах плацежных картак і рэштках па рахунках, даведацца коды з СМС-паведамленняў ад банка, выманіць пашпартныя даныя. Варта адзначыць, што часта зламыснікі звяртаюцца па імені і па бацьку, часам называюць нумар карты кліента. Усё гэта яшчэ больш усыпляе пільнасць людзей. А дарма.

Аддзел камунікацый банка папярэджвае ўсіх сваіх кліентаў аб тым, што трэція асобы ні ў якім разе не павінны ведаць рэквізіты вашай банкаўскай плацежнай карткі: яе нумар, тэрмін дзеяння, код CVV. Нельга выдаваць коды доступу, сеансавыя ключы і іншую інфармацыю з СМС-паведамленняў, якія дасылаюцца пры здзяйсненні плацяжоў у інтэрнэт-банкінгу, а таксама пры ажыццяўленні некаторых іншых аперацый.

Фінансавыя эксперты звяртаюць увагу на тое, што сапраўдным супрацоўнікам банка няма неабходнасці ўдакладняць у кліентаў якія-небудзь персанальныя даныя — фінансавыя ўстановы маюць іх у поўным аб'ёме з самага пачатку абслугоўвання. Таму, пры найменшым падазрэнні на нядобрасумленнасць таго, хто тэлефануе, спашліцеся на занятасць, перапыніце размову і самі набярыце ў банк, каб пераканацца ў сваёй бяспецы. Важна ведаць: у выпадку рэальнай пагрозы картка блакуецца банкам без усялякага ўдзелу трымальніка.

Акрамя таго, па інфармацыі страхавога партнёра «Беларусбанка» ДБА ЗАСТ «Купала», актывізаваліся ашуканцы, якія, прадстаўляючыся работнікамі страхоўшчыка, спрабуюць выманіць персанальныя даныя жыхароў нашай краіны. Будзьце ўважлівыя і асцярожныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Месцамі — да плюс 30!

### Беларускі парадокс: на паўднёвым усходзе краіны цяплей уначы, чым удзень па паўночным захадзе

**Беларусь не вялікая, ды і не горная дзяржава, але нават у нас бываюць анамальныя перапады тэмператур. Вось і гэтымі днямі, у пачатку верасня, на тэрыторыі краіны чакаецца рэзкі кантраст тэмператур у розных рэгіёнах Беларусі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У першы дзень восені надвор'е ў краіне ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі раніцай і ўдзень па паўднёвым захадзе адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Чакаецца пераменная воблачнасць, а ўдзень, пераважна па паўднёва-заходняй часцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах чакаюцца навальніцы і ліўні. Вецер прагназуецца паўночны, паўночна-ўсходні — 4—9 м/с, пры навальніцах з парывамі да 14 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 да 14 градусаў, па паўднёвым усходзе — плюс 15—17 градусаў. Значны цеплавы кантраст мы адчуем у разгар дня, калі тэрмометры пакажуць ад плюс 15 градусаў па захадзе краіны да 27 цяпла па паўднёвым усходзе.

А вось у сераду Беларусь апынецца на перыферыі скандынаўскага антыцыклону, калі на захадзе нашага рэгіёна адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Месцамі, пераважна ў заходняй частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Уначы і раніцай па паўднёвым захадзе чакаецца слабы туман. У гэтыя суткі нас чакаюць даволі душная ноч і гарачы дзень. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—20 цяпла, удзень будзе ад плюс 19 градусаў па паўночным захадзе краіны да 31 градуса цяпла па паўднёвым усходзе.

Таксама даволі гарачая ноч прагназуецца нашымі спецыялістамі і ў чацвер. У гэты дзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 да плюс 19 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — 8—11 цяпла. Удзень спякота трохі спадзе: будзе ў асноўным 19—24 цяпла, але па паўднёвым усходзе краіны значна цяплей — плюс 25—29 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу пераважна па ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ўжо камфортная і складзе 7—14 цяпла. Праўда, па паўднёвым усходзе краіны нават уначы чакаецца да плюс 17 (!) градусаў. Удзень будзе 18—25 цяпла.

Як вам такі пачатак восені? Больш нагадвае другую дэкаду жніўня, а то і наогул разгар лета...

**Сяргей КУРКАЧ.**

Аты-баты

## ЗАВЯРШАЕЦЦА КОМПЛЕКСНАЕ ВУЧЭННЕ

**На Гродзенскім тактычным напрамку ўваходзіць у завяршальную фазу комплекснае тактычнае вучэнне са зводнай групоўкай войскаў. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве абароны.**

У прыватнасці, свае задачы па прызначэнні выконваюць разведвальныя падраздзяленні 11-й асобнай механізаванай брыгады. У сваю чаргу, падраздзяленні 465-й ракетнай брыгады і 336-й рэактыўнай артылерыйскай брыгады нясуць баявое дзяжурства.

Дадаткова прызначаныя сілы паступова выводзяцца са складу дзяжурных па супрацьпаветранай абароне і вяртаюцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі. Маніторынг мясцовасці вядуць падраздзяленні беспілотных авіяцыйных комплексаў. Разведкай займаюцца таксама падраздзяленні радыёэлектроннай барацьбы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Вабішчэвічу Пятру Андрэевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# «ПА СВАЁЙ ПРЫРОДЗЕ ЦАРКВА СТАІЦЬ НАД СУТЫЧКАМІ І АКОПАМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Якія, на ваш погляд, асаблівасці стаўлення грамадства да рэлігіі ў Беларусі?***

— Асаблівасць беларускага грамадства ў тым, што ў нас большасць насельніцтва (па розных замерах ад 70 да 75 працэнтаў) ідэнтыфікуе сябе з праваслаўем. Пры гэтым праваслаўных у нас больш, чым тых, хто верыць у Бога, а само праваслаўе паспяхова ўжываецца з элементамі паганства і эзатэрыкі, верай у НЛА, псоту, хірамантыю, рэінкарнацыю і да т. п.

Такая мазаіка рэлігійных уяўленняў беларусаў звязаная з нашай гісторыяй, калі рэлігія часта станавілася «разменнай манетай» у барацьбе сумежных дзяржаў за беларускія землі. Гэта сфарміравала схаваны, няяўны, але глыбінны характар «народнага» беларускага праваслаўя, якое выступае сёння адной з асноў нашай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Сама ж Царква традыцыйна займае лідзіруючыя пазіцыі ў рэйтынгах узроўню даверу грамадства. З Царквой у многіх людзей звязваюцца чаканні з нагоды фарміравання базавых каштоўнасцяў, традыцый, гістарычнай памяці грамадства.

***— Як на міжканфесійныя і міжрэлігійныя адносіны ў нашай краіне паўплывалі падзеі апошніх тыдняў?***

— Мы прывыклі да таго, што цярпімасць да розных вераванняў і культур з'яўляецца візітнай карткай беларусаў, своеасаблівым брэндам нашай краіны. Рэлігійная тканіна грамадства складвалася стагоддзямі, міжрэлігійныя адносіны ў Рэспубліцы Беларусь характарызуюцца стабільнасцю, а канфесійная структура беларускага грамадства за апошнія пяць-дзесяць гадоў не зведала істотных змен, што сведчыць пра яе сфарміраванасць і ўстойлівасць.

Наколькі змянілася (калі змянілася) стаўленне грамадства да Царквы і іншых канфесій, досыць дакладна пакажуць сацыялагічныя замеры, аднак рызыкну выказаць здагадку, што нават у выпадку прыкметных змен яны будуць насіць часовы характар. Грамадства наэлектрызаванае, адчувае пастаянную «напампоўку» і маніпуляцыйнае ўздзеянне інфармацыйнага поля, і таму схільнае да эмацыянальных ацэнак.

Апытанні грамадскай думкі дазволяць вызначыць рэальнае месца рэлігіі і ступень яе ўплыву на бягучыя палітычныя працэсы без прыпісвання ёй жаданых, але не заўсёды адпавядаючых рэчаіснасці прыкмет і функцый. Гэта дапамагло б зразумець не толькі грамадству, але і самой Царкве яе рэальнае месца ў сучасным соцыуме.

***— Чым небяспечна ўмяшанне дзяржавы ва ўнутраныя справы Царквы?***

— Пытанне цікавае. Гледзячы што лічыць умяшаннем або неўмяшаннем дзяржавы. Напрыклад, тое, што Царква ў Рэспубліцы Беларусь вызвалена ад выплаты падатку на нерухомасць і зямельнага падатку, — гэта ўмяшанне дзяржавы? Рэстаўрацыя дзяржавай помнікаў архітэктуры, у тым ліку храмаў, — гэта ўмяшанне дзяржавы?

Поўнае самаўхіленне дзяржавы — гэта амерыканская ліберальная мадэль дзяржаўна-канфесійных адносін, калі рынак рэлігійных паслуг абсалютна свабодны і нікому (як многія думаюць) непадкантрольны. З аднаго боку, быццам прывабна, з другога боку, мы ў сярэдзіне 1990-х пайшлі па гэтым шляху і сутыкнуліся са скачкападобным ростам сектаў, неакультаў, новых рэлігійных рухаў, некаторыя з якіх, як мы памятаем, насілі дэструктыўны характар, а офісы большасці з іх знаходзіліся і знаходзяцца ў ЗША.

У той жа час, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», «дзяржава не ўскладае на рэлігійныя арганізацыі выкананне якіх-небудзь дзяржаўных функцый, не ўмешваецца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый, калі яна не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь». Царква сама вызначае сваю структуру, парадак набажэнстваў, унутранага кіравання і г. д.

***— Ці павінна і ці можа Царква заставацца ўбаку ад палітычных працэсаў у грамадстве?***

— Тут лепш адказаць словамі самой Царквы, палажэннем яе сацыяльнай канцэпцыі, якое абвяшчае, што «ва ўзаемаадносінах паміж Царквой і дзяржавай павінна ўлічвацца адрозненне іх прырод... Мэтай Царквы з'яўляецца вечнае выратаванне людзей, мэта дзяржавы заключаецца ў іх зямным дабрабыце». Чакаць ці тым больш патрабаваць ад Царквы нейкіх імгненных заяў, падладжвання пад палітычную кан'юнктуру — значыць не разумець сутнасці і прызначэння Царквы. Гэта два арганізмы з зусім рознымі задачамі і бачаннем сваёй ролі ў гэтым свеце.

Любая рэлігія — гэта ўстойлівая мадэль узнаўлення такіх базавых катэгорый, як каштоўнасці, сям'я, стаўленне да працы, блізкіх і іншых. Праваслаўе і Царква як сацыяльная мадэль найбольш блізкія да канцэпцыі сацыяльнай дзяржавы. Убудаванне гэтай мадэлі ў стратэгічныя кірункі развіцця нашай дзяржавы будзе спрыяць рэалізацыі агульных мэт.

***— Як вы ацэньваеце нядаўнюю змену кіраўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы?***

— У гэтым няма нечага звышнеардынарнага, бо мы ўжо перажылі адну змену Патрыяршага Экзарха, калі ў 2013 годзе мітрапаліта Філарэта змяніў мітрапаліт Павел. Гэта заканамерны працэс для любой арганізацыі, шлях развіцця, руху наперад. Для вучонага і аналітыка, магчыма, быў бы цікавы аналіз магчымых раскладаў, унутраных рухаў і маючых адбыцца кадравых перастановак. Для нерэлігійнага чалавека, хутчэй за ўсё, гэта падзея наогул пройдзе незаўважанай, а для верніка галоўнае — храм, малітва, магчымасць адчуваць сябе ва ўлонні Царквы.

***— Ці зменіцца, на вашу думку, курс развіцця Беларускай праваслаўнай царквы са зменай яе кіраўніка?***

— Напэўна, пра гэта рана казаць, тым больш што на знешнім контуры Беларуская праваслаўная царква (Беларускі Экзархат) не з'яўляецца самастойным суб'ектам, уяўляе сабой структурнае падраздзяленне Рускай праваслаўнай царквы, кажучы сучаснай мовай, тэрытарыяльны офіс. А Руская праваслаўная царква перажывае цяпер няпростыя часы, звязаныя з расколам праваслаўнага свету і размежаваннем праваслаўных памесных цэркваў з нагоды ўкраінскага томасу.

У той жа час новы Патрыяршы Экзарх — кампрамісная постаць для бурлівага беларускага соцыуму, і яго слова будзе як ніколі значнае. З тым, што Патрыяршым Экзархам упершыню стаў ураджэнец Беларусі і выпускнік беларускай духоўнай установы, многія звязваюць чаканні новага этапу ў развіцці нацыянальнай духоўнай традыцыі: пытанняў адукацыі, выдавецкай дзейнасці, міжнароднай пазнавальнасці беларускіх святынь.

***— Як вы прагназуеце змяненне стаўлення грамадства да рэлігійных арганізацый пасля пераадолення грамадска-палітычнага крызісу ў Беларусі?***

— Мы зараз знаходзімся ў парадыгме пераадолення, рана ці позна вернемся да парадыгмы развіцця. Крызіс у перакладзе з грэчаскай — паваротны пункт, пункт пачатку новага шляху. Царква назапасіла велізарны досвед работы з найбольш уразлівымі слаямі насельніцтва, мае найбольш высокі ўзровень даверу ў грамадстве і значны патэнцыял добраахвотніцтва. Па сваёй прыродзе яна стаіць над сутычкамі і акопамі. Гэта можа стаць адной з асноў «перазагрузкі» адносін грамадства, Царквы і дзяржавы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Медыя

# Выжыць у эпоху постпраўды

**Фэйкі, постпраўда, маніпуляцыйныя тэхналогіі — гэтыя тэрміны, раней вядомыя толькі спецыялістам сферы масавых камунікацый, апошнім часам увайшлі ў штодзённы парадак навін і размоў у грамадстве. Магчымасць атрымліваць дакладную, аб'ектыўную і актуальную інфармацыю сёння стала не зразумелай рэчаіснасцю, а хутчэй прывілеем. Інфармацыі шмат — з разнастайных крыніц, для рознага кола чытачоў. Таму «медыяадукаванасць» магчыма разглядаць як яшчэ адну дысцыпліну для навучання не толькі маладога пакалення, але і людзей сярэдняга ўзросту. Выказаць свае думкі на гэты конт аглядальнік «Звязды» папрасіла палітычнага аналітыка Аляксандра ШПАКОЎСКАГА.**




Фота БелТА.

***— Як аўдыторыі лавіраваць у свеце інфармацыі, каб выбудоўваць свой погляд на працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве?***

— У сучасным інфармацыйным свеце чалавеку вельмі цяжка арыентавацца ў навінавых патоках, якія часта нясуць вельмі ангажаваную альбо адкрыта выдуманую сэнсавую нагрузку. Яшчэ ў 2016 годзе, па версіі Оксфардскага слоўніка, словам года стала «постпраўда» (post-truth), якое азначае сітуацыю, калі «аб'ектыўныя факты менш важныя для фарміравання грамадскай думкі, чым зварот да эмоцый і асабістых перакананняў».

Па сутнасці справы, так званыя фэйкі (лжывыя паведамленні), прыёмы маніпуляцыі масавай свядомасцю заўсёды прысутнічалі ў грамадска-палітычным жыцці чалавецтва, аднак развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій істотна аблягчыла іх распаўсюджванне на максімальна шырокую аўдыторыю.

Акрамя таго, магчымасць атрымання «імгненныхведаў» шляхам пошукавых запытаў у сеціве абясцэньвае само значэнне інфармацыі і ўсебаковай адукацыі, а чалавек з кліпавым мысленнем становіцца лёгкай здабычай маніпулятараў.

Таму выхадам у гэтай сітуацыі з'яўляецца шматграннае развіццё асобы з дзяцінства ў сям'і і школе, прывіццё чалавеку навыкаў паранальнага аналізу, ведаў у вобласці інфармацыйнай гігіены. Уяўляецца, што без гэтага ў грамадстве, якое, на думку многіх даследчыкаў, існуе ў эпоху постпраўды, выжыць у якасці «чалавека разумнага» практычна немагчыма.

***— Сёння для многіх, асабліва для моладзі, асноўны пастаўшчык навін — сацсеткі. Наколькі трэба ім давяраць, як не трапіць у пастку іх тэндэнцыйнасці ў падачы інфармацыі?***

— Па звестках беларускага інтэрнэт-правайдара «Белтэлекам», толькі 4 працэнты грамадзян нашай краіны ва ўзросце 16—24 гадоў не маюць асабістых акаўнтаў у сацыяльных сетках. Аднак гэта не значыць, што тыя маладыя людзі не карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі зусім.

На цяперашнім этапе можна казаць пра тое, што сацыяльныя сеткі з'яўляюцца прасторай асабістага жыцця і найважнейшым каналам атрымання навін пра навакольны свет і нашу краіну для беларускай моладзі. Гэты факт не з'яўляецца сакрэтам для рознага роду дэструктыўных сіл, крымінатэту, а таксама апанентаў беларускай дзяржавы. Таму ў сацыяльных сетках існуе нямала віртуальных супольнасцяў экстрэмісцкага толку.

Пры гэтым толькі за кошт блакіравання дэструктыўных рэсурсаў і супольнасцяў немагчыма дасягнуць мэты абароны грамадства ад ілжывай і негатыўнай інфармацыі ў сацыяльных сетках. Акрамя развіцця навыкаў інфармацыйнай гігіены і паранальнага аналізу, пра што было сказана вышэй, таксама неабходна мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка па выкрыцці фэйкаў і прасоўванні ўласнага пазітыўнага кантэнту з прыцягненнем шырокага кола канструктыўных і здаровых сіл нашага грамадства.

Інтэрнэт і сацыяльныя сеткі на сённяшні дзень з'яўляюцца прасторай барацьбы за свядомасць моладзі, таму ўсе магчымыя сілы і сродкі павінны быць кінутыя менавіта на дадзены кірунак, гэта ключавое пытанне будучага развіцця Беларусі.

***— Якімі крыніцамі інфармацыі вы карыстаецеся штодня?***

— Як палітычны аналітык на працягу дня я вывучаю некалькі дзясяткаў айчынных і замежных крыніц інфармацыі, у тым ліку друкаваныя і электронныя СМІ, тэлебачанне, меркаванні калег у тэлеграм-каналах і сацыяльных сетках. Дарэчы пра тэлеграм-каналы: рэкамендую чытаць або аўтарскія, альбо ведамасныя блогі, каналы інфармацыйных агенцтваў і зарэгістраваных СМІ. У гэтым выпадку аўтары нясуць адказнасць за інфармацыю, а рознага роду ананімныя «інсайдары», як паказвае практыка, у асноўным дэзынфармуюць сваю аўдыторыю з рознымі мэтамі і нярэдка з'яўляюцца праектамі спецслужбаў альбо паліттэхнолагаў, якія спрабуюць такім чынам маніпуляваць людзьмі.

***— Асноўнае патрабаванне да журналістыкі, якое існавала заўсёды, — аб'ектыўнасць. Як працаваць журналістам у сучасным свеце адпаведна гэтаму прынцыпу з улікам таго, што ўладальнікі СМІ заўсёды імкнуцца падаць неабходны ім погляд на падзеі?***

— У Рэспубліцы Беларусь існуе ўнікальны дакумент — Кодэкс прафесійнай этыкі журналіста, дзе артыкул 2 так і называецца: «Праўдзівасць і аб'ектыўнасць». Вядома, рэдакцыя любога СМІ спрабуе праводзіць пэўную інфармацыйную палітыку, а журналісты ў гэтай сітуацыі выконваюць даручэнні работадаўца. Аднак заўсёды існуюць «чырвоныя лініі», якія паважаючы сябе рэдактар і журналіст пераступаць не мае ні маральнага, ні законнага права.

Трэба разумець, што там, дзе пачынаюцца паклёп, абразы, заклікі да фізічнага гвалту, усякая свабода слова і журналістыка заканчваюцца. Ніякай індульгенцыі ад адказнасці перад законам у такога роду «журналістаў» няма і быць не можа.

Таму адказ просты: нягледзячы на асабістыя перакананні, у сваёй дзейнасці журналісту трэба кіравацца заканадаўствам, Кодэксам прафесійнай этыкі і агульначалавечымі маральнымі прынцыпамі.

***— Ці існуюць, на ваш погляд, у нашай краіне крыніцы інфармацыі, якія максімальна аб'ектыўна асвятляюць падзеі, што адбываюцца ў Беларусі?***

— Такія крыніцы ёсць, і іх нямала, у тым ліку ваша газета. На мой суб'ектыўны погляд, менавіта дзяржаўныя СМІ ў гэты няпросты палітычны перыяд, у якім знаходзіцца наша краіна, імкнуцца да максімальна карэктнага асвятлення бягучай сітуацыі — без злоснага ганення, канфрантацыйнага тону і навешвання ярлыкоў.

**Размаўляла Марыя ДАДАЛКА.**

# ПА ВЕДЫ БЕЗ ПАЛІТЫКІ

**Сістэма адукацыі Віцебскай вобласці па выніках мінулага года была прызнана профільным міністэрствам найлепшай у краіне. У новым навучальным годзе тут за парты сядзе больш за 112 тысяч юных грамадзян краіны, у тым ліку каля 12,5 тысячы першакласнікаў.**

Сёлета ўпершыню традыцыйную жнівеньскую абласную педагагічную канферэнцыю правялі ў фармаце відэасувязі. Пра важнасць падзеі сведчыць тое, што старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў не толькі прысутнічаў, але агучыў думкі наконт таго, што адбываецца, і датычыцца кожнага настаўніка, выкладчыка.

Ён зрабіў акцэнт на тым, што ўстановы адукацыі не павінны быць месцам для палітыкі, ідэалагічных спрэчак і сутыкненняў поглядаў, канфрантацыі. Кіраўнік вобласці таксама выказаў упэўненасць у тым, што ў педагогаў дастаткова запасу ўнутранай трываласці. І гэта дазваляе цвяроза ацаніць сённяшнюю сітуацыю, убачыць глыбінны сэнс, аналізаваць і выдзяляць галоўнае.

«Школа не павінна быць палітычным аб'ектам у спрэчках і рознагалоссі, школа павінна быць па-за палітыкай. Гэта наш цвёрды дэвіз па жыцці. Горда нясіце званне настаўніка! Упэўнена глядзіце наперад і нічога не бойцеся!» — пакрэсліў Мікалай Шарснёў.

Педагогаў, вучні якіх становяцца прамоцамі міжнародных прадметных алімпіяд і гэтак далей, узнагароджваюць прэміямі абласнога выканкама. Напрыклад, у мінулым вучэбным годзе больш за трыццаць.

Асаблівую ўвагу і надалей кіраўнікі выканаўчай улады Прыдзвінскага краю будуць удзяляць стварэнню сучасных умоў у сельскіх школах.

У праект мадэрнізацыі сістэмы адукацыі Беларусі за кошт сродкаў пазык Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця ўключаны 42 установы агульнай сярэдняй адукацыі вобласці. На капітальны рамонт і мадэрнізацыю вылучана 4,6 мільёна долараў і 16,6 мільёна еўра. Гэта вялікія грошы, якія дапамогуць адкрыць у кожным раёне «Школу будучыні».

Дарэчы, начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый Хома канстатуе, што сёлета на рамонты ўстаноў адукацыі запланавана выкарыстаць больш чым 30 мільёнаў рублёў. А за чатыры гады пяцігодкі на гэта ж было выдаткавана 92 мільёны, плюс на набыццё абсталявання яшчэ 35 мільёнаў.

Новыя дзіцячыя садкі з'явіліся ў Віцебску, Глыбокім, Оршы, Наваполацку, ажыццяўляецца будаўніцтва садка ў Паставах.

1 верасня расчыняцца дзверы самай лепшай школы вобласці ў мікрараёне Білева. Там выдатныя вучэбныя кабінеты. Ёсць гульнявыя і спартыўныя пляцоўкі, гімнастычная, трэнажорная, харэаграфічная залы, два басейны...

Улічваючы зацікаўленасць улады ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных рабочых, ствараюцца рэсурсныя цэнтры. Яны ўжо паспяхова дзейнічаюць у Віцебску, Полацку, Оршы, Гарадку. Там рыхтуюць кадры для прадпрыемстваў металаапрацоўкі і будаўніцтва, лёгкай прамысловасці і машынабудавання, сельскай гаспадаркі. У гэтых цэнтрах павышаюць кваліфікацыю і тыя, хто ўжо працуюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# У НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД — З НОВЫМІ ШКОЛАМІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Новую сярэднюю школу адкрыюць 1 верасня і ў мінскім мікрараёне Каменная Горка — 3. Установа адукацыі разлічана на 1020 месцаў, але дакументаў пададзена амаль на дзве тысячы дзяцей, таму навучанне тут таксама будзе арганізавана ў дзве змены. Сёлета плануецца адкрыць 10 першых класаў. Сучасны адукацыйны цэнтр мае добрую спартыўную базу, якая ўключае, у прыватнасці, басейн з малой і вялікай (на 10 і 25 метраў) чашамі. Яго паслугамі змогуць скарыстацца і дарослыя. На тэрыторыі школы абсталяваны баскетбольная і валейбольная пляцоўкі, а таксама пляцоўка для страявой падрыхтоўкі.

А школу, якая прыме сваіх першых вучняў у сталічным мікрараёне Новая Баравая яшчэ да пачатку будаўніцтва называлі «першай школай будучыні», самай інавацыйнай пляцоўкай для школьнікаў. Яна складаецца з навучальных карпусоў для пачатковых і старэйшых класаў і спартыўнага цэнтра з басейнам і спартзалай.

У холах рэалізаваныя ідэі з навуковых інтэрактыўных музеяў — напрыклад, ёсць люстэрка з эфектам «падману зроку». У калідорах — панарамныя вокны. Падваконнікі зроблены так, каб на іх можна было сядзець. Усе кабінеты разлічаны на 20 чалавек, і ў кожным прасторныя дзверы — для адчування свабоды.

У бібліятэцы прадугледжана шмат зручных месцаў для адпачынку. З бібліятэкі ёсць выхад на эксплуатаваны дах, дзе таксама можна адпачываць: для бяспекі школьнікаў там усталяваная высокая агароджа.

У Міністэрстве адукацыі кажуць, што навучальны год стартуе ў звычайным рэжыме, але на выпадак росту захваральнасці на каранавірус былі распрацаваны дакладны алгарытм дзеянняў — як працягваць вучэбны працэс у складаных эпідэміялагічных умовах.



Фота БелТА.

Пачынаючы з 2015 года ў беларускіх школах распачаўся паэтапны пераход на абноўлены змест навучання. За гэты перыяд ужо выдадзена 217 навучальных дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У гэтым годзе іх колькасць павялічыцца на 50, з іх 17 былі створаны для вучняў 10-га класса, якія будуць займацца па новых навучальных праграмах.

Усе дапаможнікі прайшлі ліцэнзаванне метадыстамі, навукоўцамі, настаўнікамі, абавязковую псіхолага-педагагічную экспертызу. Асаблівасцю новых навучальных дапаможнікаў з'яўляецца наяўнасць электронных дадаткаў, якія забяспечваюць засваенне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні. Пераход беларускіх школ на новыя вучэбныя праграмы завершыцца ў наступным навучальным годзе.

У Беларусі вельмі кваліфікаваны настаўніцкі корпус. 35 % настаўнікаў маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і 40 % — першую. Ёсць яшчэ такая катэгорыя, як настаўнікі-метадысты — гэта сапраўдная педагагічная эліта. Іх каля 400 чалавек: яны працуюць непасрэдна з калегамі і дзеляцца з імі сваім досведам. Таксама сёлета ў навучальныя ўстановы былі накіраваны 4722 маладыя спецыялісты.

У Міністэрстве адукацыі сцвярджаюць, што ў сістэме адукацыі адзін з самых высокіх паказчыкаў па замацаванасці маладых спецыялістаў: на першым месцы застаюцца і надалей працаваць не менш за 80 працэнтаў выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## «Восень са «Звяздой»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2020 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б.Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 16 кастрычніка 2020 года будуць разыграны 7 здрабняльнікаў-чопераў Galaxy GL і суперпрыз — сушка для агародніны і садавіны Redmand. Вынікі будуць апублікаваныя ў газеце «Звязда» да 25 кастрычніка 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 165 газеты «Звязда» ад 26 жніўня.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2020 да 31.12.2020.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3840 ад 21.08.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
*(аддзяленне сувязі)*

______________________ **на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [      ] *(індэкс)* ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!


## Меркаванне

# «У АДУКАЦЫІ НАЙВАЖНЕЙШАЯ РОЛЯ!»

**Валянціна БАГАТЫРОВА, доктар эканамічных навук, прафесар, рэктар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава:**



— Адукацыя — гэта платформа развіцця грамадства, а не арэна для высвятлення адносін.

Сёння наша краіна перажывае няпросты перыяд, якому ўласцівыя глыбокія палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя рознагалоссі.

Звяртаючыся прадстаўніком супольнасці навукоўцаў і педагогаў, перш за ўсё, звяртаюся да нашай моладзі, нашых студэнтаў і навучэнцаў, іх бацькоў. Размаўляючы адзін з адным, абмяркоўваючы розныя пытанні (нават тыя, якія вас глыбока турбуюць), неабходна памятаць, што кожны з нас не фарміраваўся і не будзе фарміравацца ва ўмовах па-за і без сістэмы адукацыі. А гэтая сістэма трымаецца на непарушных пастулатах: павагі вучня да настаўніка і любові настаўніка да вучняў. Калі сёння мы разам дазволім хоць бы пахіснуцца гэтым асновам, не кажучы ўжо пра непасрэдны ўдзел у іх развале, на справе згуляем на руку тым, хто даўно дзейнічае ў кірунку паслаблення дзяржавы. У тым ліку праз зніжэнне ўзроўню адукаванасці насельніцтва (досыць паглыбіцца ў змест работ вядомага ва ўсім свеце амерыканскага палітолага, паляка па паходжанні, які аказаў немалы ўплыў на знешнюю палітыку ЗША, Збігнева Бжэзінскага).

Прывяду некалькі выказванняў вядомых людзей на тэму найважнейшай ролі адукацыі.

«Усе, хто разважаў пра мастацтва кіравання чалавецтвам, прыходзілі да высновы, што лёс імперый залежыць ад адукацыі моладзі». (Арыстоцель).

«Што можа быць вялікім ці лепшым падарункам, які мы можам даць рэспубліцы, чым навучанне і асвета нашай моладзі?» (Цыцэрон).

«Аснова ўсёй дзяржавы складаецца ў правільным выхаванні юнацтва» (Цыцэрон).

«Аснова любой дзяржавы — адукацыя сваёй моладзі» (Дыяген).

«Ад адукацыі людзей краіны залежыць яе лёс» (Бенджамін Дызраэлі; прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі ў XIX стагоддзі).

«Прагрэс нашай краіны не можа быць больш хуткім, чым прагрэс нашай адукацыі» (Джон Фіцджэралд Кенэдзі).

«Асвета і патрыятызм ствараюць нацыі; невуцтва і эгаізм ствараюць чэрнь» (П'ер Буаст, філосаф).

«Універсітэт — установа, прызначаная для таго, каб дзеці падняліся на больш высокую прыступку ў грамадстве, чым іх бацькі» (Генры Менкен, журналіст).

Каля ўвахода ў Стэленбоскі ўніверсітэт (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка) вісіць наступнае паведамленне: «Знішчэнне любой нацыі не патрабуе атамных бомбаў або выкарыстання ракет далёкага радыуса дзеяння, патрабуецца толькі зніжэнне якасці адукацыі і дазвол падману на іспытах навучэнцаў. Пацыенты паміраюць ад рук такіх лекараў. Будынкі руйнуюцца ад рук такіх інжынераў. Грошы страчваюцца ад рук такіх эканамістаў і бухгалтараў. Справядлівасць страчваецца ў руках такіх юрыстаў і суддзяў. Крах адукацыі — гэта крах нацыі».

Што ж мы назіраем у рэальнасці? Настаўнікі падвяргаюцца ціску з боку сваіх вучняў і іх бацькоў. А зусім хутка неабходна пачынаць новы навучальны год, ісці ў клас, сеяць добрае, вечнае.

Як гэта рабіць на высокім якасным узроўні ва ўмовах, калі выпускнікі дазваляюць сабе адмаўляцца ад заслужаных медалёў, атэстатаў? І робяць з гэтага сапраўдную падзею, заклікаючы браць з іх прыклад, калі лічаць магчымым пісаць непрыстойныя звароты на адрас устаноў адукацыі.

Мне ўяўляецца, сёння важна нам усім усвядоміць, што нашы дзеці і маленькія, і дарослыя змогуць асвойваць адукацыйную праграму толькі пад кіраўніцтвам прафесіянала і толькі тады, калі гэты прафесіянал будзе адчуваць сябе ўпэўнена ў аўдыторыі, таму што яго любяць, шануюць, чакаюць яго вучні, якіх ён любіць і паважае ўзаемна.

Мы мелі магчымасць ацаніць велізарную ролю настаўніка ў адукацыйным працэсе, калі сутыкнуліся з каранавіруснай інфекцыяй і навучаліся па-за аўдыторыямі. Кожны з бацькоў адчуў на сабе, што гэта за праца — вучыць дзіця. У той перыяд часу мы ўсе непадробна захапляліся моцнымі нервамі і любоўю да прафесіі педагога. Гэтак жа сама, як і ўсхвалялі (абсалютна заслужана) працу людзей у белых халатах. Нашы настаўнікі і выкладчыкі засталіся ранейшыя. Іх задача разам з намі захаваць найважнейшую платформу паспяховага развіцця сучаснага грамадства — сістэму адукацыі нашай дзяржавы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Дажынкі-2020

# З ПАРАДАМ ТЭХНІКІ, УЗНАГАРОДАМІ І КАНЦЭРТАМ

**На Свіслаччыне прайшлі раённыя «Дажынкі-2020»**



Фестываль хлебаробаў пачаўся з парада сельскагаспадарчай тэхнікі. Па вуліцы перад плошчай прайшлі найноўшыя экзэмпляры сельгасмашын, якія задзейнічаны ва ўсіх відах палявых работ. А гэта і энерганасычаныя трактары, шматфункцыянальныя агрэгаты, сучасныя камбайны, шматтонныя МАЗы... Пасля парада свята перамясцілася ў раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці, дзе адбылося ўрачыстае ўшанаванне работнікаў АПК.

Напачатку ўрачыстасці выступіў **старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ,** які павіншаваў усіх прысутных з завяршэннем чарговай уборачнай кампаніі. Паводле яго слоў, работы праведзеныя максімальна хутка, атрыманы добры ўраджай. Прадстаўнікі выканаўчай улады, раённага Савета дэпутатаў, прафсаюзаў уручылі ўзнагароды тым работнікам, якія паказалі найлепшыя вынікі на жніве, расказвае «Свіслацкая газета».

Усе гаспадаркі раёна прадставілі прыгожыя каравai, выпечаныя з мукі новага ўраджаю. Былі арганізаваныя дажыначныя падворкі, дзе кожны мог пачаставацца рознымі прысмакамі. Канцэрт з удзелам арт-групы «Беларусы» падараваў добры настрой усім прысутным.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# З ФІЛАРМОНІІ Ў... КОСМАС

**Канцэрт арганнай музыкі «Касмічнае падарожжа» стаў цудоўным падарункам для дзяцей і падлеткаў Прыдзвінскага краю ад Віцебскай абласной філармоніі.**

Свята музыкі з грандыёзным і велічным каралём музычных інструментаў — арганам — адбылося напярэдадні пачатку навучальнага года.

Як паведамілі ў дырэкцыі філармоніі, ён планаваўся яшчэ ў дзень касманаўтыкі, але ж пандэмія ўнесла свае карэктывы нават у тое, што звязана з космасам... І вось урэшце доўгачаканая падзея адбылася!



Выконваліся зусім розныя творы, у тым ліку нават папулярная музыка з кіно на касмічную тэматыку. Выступленне флейтысткі, відэа з папулярных фільмаў на касмічную тэму, падсветка сцэны, дэманстрацыя тэматычных фільмаў — гэта заваражвала!

У найбліжэйшы час у філармоніі распачнецца новы творчы сезон. Адна з галоўных задач калектыву — зацікавіць землякоў класічнай музыкай, якая развівае духоўна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Прыемная навіна

## Жыллё для вяскоўцаў

**За студзень—ліпень гэтага года ў Мінскай вобласці ўведзена ў дзеянне 586,9 тысячы квадратных метраў жылля. У тым ліку 501,3 тысячы «квадратаў» прызначана для жыхароў сельскай мясцовасці і малых гарадскіх населеных пунктаў. Такія факты агучылі ў камітэце эканомікі Мінаблвыканкама.**

Значная ўвага ўдзялялася забеспячэнню жыллём грамадзян і сем'яў, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і стаялі на чарзе. Для іх узведзена 151 тысяча квадратных метраў, прычым 101,1 тысячы «квадратаў» — з дзяржаўнай падтрымкай.

Усяго ж сёлета ў цэнтральным рэгіёне плануецца здаць у эксплуатацыю 1120 тысяч квадратных метраў жылля.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Новыя школы і садкі прымуць дзяцей на Міншчыне

**Сёлета на Міншчыне дванаццаць новых дашкольных і сярэдніх устаноў адукацыі расчыняць дзверы для малых выхаванцаў і вучняў.**

Па інфармацыі галоўнага ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама, чатыры дзіцячыя садкі ўжо адкрыты — у Бараўлянах, Ратамцы, Копішчы і Калодзішчах. Да канца года будуць пабудаваны яшчэ сем — у Чэрвені, Івянцы, Смалявічах, Мачулішчах, Міханавічах, Сеніцы і Хацежыне. Першага верасня вучняў прыме новая школа ў Копішчы, разлічаная на 1020 месцаў.

Значную ўвагу абласныя ўлады надаюць добраўпарадкаванню дзеючых дашкольных і школьных устаноў адукацыі. У адпаведнасці з праектам Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця «Мадэрнізацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь» сёлета плануецца завяршыць рамонт устаноў адукацыі ў Вілейскім, Валожынскім, Клецкім і Капыльскім раёнах.

Дарэчы, у межах падрыхтоўкі да новага навучальнага года рамонт праведзены больш як у 400 установах вобласці. Закупленыя 40 школьных аўтобусаў, якія будуць падвозіць дзяцей да месца вучобы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Бывай, лета!

## СВЯТА ДЗЯЦІНСТВА

Напярэдадні Дня ведаў у Магілёве дзеці і дарослыя яшчэ раз акунуліся ў вясёлыя бестурботныя дзянькі

**Весела і з карысцю правялі апошнія выхадныя дні лета тыя, хто завітаў на гэтае свята. Мерапрыемства было арганізавана непасрэдна на плошчы Славы, дзе звычайна праводзяцца ўрачыстыя афіцыйныя мерапрыемствы накшталт Дня Перамогі або Дня незалежнасці.**

У мінулыя выхадныя тут працавалі гандлёвыя і дэманстрацыйныя палаткі, была арганізавана цікавая культурна-адукацыйная праграма. З 12 да 19 гадзін установы дадатковай адукацыі, культуры, спорту запрашалі дзяцей і іх бацькоў паўдзельнічаць у спартыўных спаборніцтвах, гульнях і конкурсах. Для тых, хто яшчэ не вызначыўся са сваім хобі, было карысна наведаць майстар-класы па малюнку, мастацкай лепцы, вязанні, бісерапляценні, народна-прыкладной творчасці. Установы аховы здароўя, МНС, ДАІ, «Магілёўаблгаза» прапаноўвалі ў гульнёвай форме праверыць веды па асновах здаровага ладу жыцця і бяспецы жыццядзейнасці. Публіка была ў захапленні ад паказальных выступленняў з удзелам службовых сабак Карата і Ібарда Форэстэра, якія арганізавалі міліцыянеры-кінолагі магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы.

Навучэнцы і выхаванцы ўстаноў дадатковай адукацыі і культуры падрыхтавалі для жыхароў Магілёва святочны канцэрт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Цікавы фармат

## Бібліятэка запрашае на лінейку

**«Восень адмяняецца, няхай жыве 32 жніўня!» — пад такім гарэзлівым дэвізам магілёўскія бібліятэкі звяртаюць на сябе ўвагу дзятвы. Святочныя літаратурныя сустрэчы пройдуць на пляцоўках каля бібліятэк імя Карла Маркса на вуліцы Першамайскай і № 9 на вуліцы Дзімітрава, а таксама ў сацыяльных сетках. Хлопчыкі і дзяўчынкі змогуць праверыць свае веды ў літаратурных віктарынах, разнастайных чэленджах, гульнявых праграмах.**

— Такі фармат зносін з нашым чытачом мы паспрабуем выкарыстаць упершыню, — адзначае **загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя К. Маркса Алена ШЭПЕЛЕВА.** — Мы вырашылі зрабіць своеасаблівую бібліятэчную лінейку, каб падарыць нашым чытачам яшчэ адзін летні дзень. У сацсетках мы падрыхтавалі анлайн-віншаванне ад літаратурных герояў, вясёлыя гульні, нясумныя заняткі.

Наогул магілёўскія бібліятэкі былі на сувязі з чытачамі ўсё лета. Яны праводзілі літаратурныя мультсеансы, кніжныя гонкі, арт-заняткі, гульнятэкі, анлайн-віктарыны. Часцей за ўсё іх удзельнікамі станавіліся вучні пятых-восьмых класаў, а таксама дзеці дашкольнага ўзросту і першакласнікі, якія прыходзілі на сустрэчы разам з бацькамі.

— Мы зацікаўліваем нашых патэнцыйных чытачоў клубамі і аб'яднаннямі, якія працуюць у структуры цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк Магілёва, — кажа Алена Шэпелева. — Уся гэта інфармацыя ёсць і на нашым сайце. Там жа можна знайсці падборку кніг па выхаванні дзяцей і арганізацыі навучальнага працэсу.

Дарэчы, 1 верасня ў парку Падніколле і ў скверы 40-годдзя Перамогі пройдуць таксама агульнагарадскія святы, прысвечаныя Дню ведаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Адкрыцці

## Як у казцы!

**Учора, у апошні дзень лета, у самым старажытным горадзе Беларусі — Полацку адбылося ўрачыстае адкрыццё пасля капітальнага рамонту дзіцячага садка № 14. Дашкольную ўстанову будуць наведваць больш за сто хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце ад 1,5 да 7 гадоў.**

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўстанове адукацыі, тут замянілі амаль што ўсё: ад падлогі да аконных блокаў. У будынку цяпер новыя дах, інжынерныя сеткі, а сцены адзетыя ў «футра». У харчовым блоку з'явілася сучаснае тэхналагічнае абсталяванне.

У дзіцячым садку стварылі камфортныя і бяспечныя ўмовы для знаходжання выхаванцаў. Па сучасных патрабаваннях абсталявалі кабінеты педагога-псіхолага, настаўніка-дэфектолага, фізкультурна-музычную залу. Малым соладка будзе спацца ва ўтульных дзіцячых спальнях. Для ўсебаковага развіцця дзяцей набыты сучасныя тэхнічныя сродкі навучання, а на гульнявых пляцоўках размешчаны новыя ценявыя навесы, гульнявыя комплексы, пясочніцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Падзея



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Свята зладзілі на базе адпачынку «Прывал», што на беразе Нёмана. Маляўнічая феерыя стала традыцыйнай падзеяй канца лета, але з кожным годам набывае новыя рысы. Сёлета свята адбылося надзвычай маштабнае, а яркія фарбы «холі» ўспыхвалі на працягу двух дзён.**

## ЯРКАЕ ВІДОВІШЧА

У Гродне прайшоў фестываль фарбаў ColorFest

Арганізатары падрыхтавалі нямала сюрпрызаў для наведвальнікаў, якіх з кожным годам становіцца ўсё больш. Асабліва ўражанне ад каляровага свята атрымалі дзеці. Дарослыя таксама не адставалі і дружна весяліліся, запускаючы адно ў аднаго мяшочкі з фарбай. Тыя, хто хацеў проста паназіраць за смешнымі падзеямі, маглі гэта зрабіць у спецыяльных зонах адпачынку. Адтуль можна было ўбачыць, як месца актыўнага фэсту ператвараецца ў вялікую карціну ў стылі імпрэсіянізму.

Для свята арганізатарам спатрэбілася некалькі сотняў кілаграмаў фарбаў. Пасля каляровага фэсту ўсіх чакала пенная вечарына і дробны душ вакол пляцоўкі. Як аказалася, фарбы «холі» лёгка адмываюцца як са скуры, так і з адзення. Удзельнікі пакінулі каляровы фэст з добрымі ўражаннямі і мноствам фотаздымкаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Пазакласнае чытанне

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

*Урывак з рамана*

# «АВАНТУРЫ ВЫРВІЧА, ЛЁДНІКА І ЧОРНАЙ МЕЛАНХОЛІІ»

## *РАЗДЗЕЛ ДРУГІ. ЯК ЛЁДНІКІ З ГРАФАМ МАНУЦЫ ПАЗНАЁМІЛІСЯ*

***(Заканчэнне. Пачатак у папярэднім нумары «Звязды».)***

Мануцы настойліва заглядаў у вакно рыдвана, і ясна было — не адчэпіцца. Ну а Лёднік хутчэй зноў кулаком карэту прадзіравіць, чым пакажацца скалечаным.

Раптам вакно рыдвана расчынілася, высунулася Сафійка.

— Няхай яснавяльможны граф прабачыць, але мой пан-бацька пачуваецца не надта добра. У яго... чорная меланхолія. Ён не ў змозе дэманстраваць свае фехтавальныя ўмельствы.

І броўку чорную прыўзняла, маўляў, што за несамавітыя паводзіны.

Вось жа няправільна шляхцюкі па патэнце Лёднікі сваіх дзяцей выхоўвалі... Ну хіба можа шляхетная дзяўчынка з незнаёмым панам першай загаварыць, ды яшчэ так дзёрзка?

Вырвіч скасавурыўся на Мануцы... І ўбачанае яму яшчэ больш не спадабалася. І чортава семя, і воўкава племя.

Граф ажно рот раскрыў, і дыханне, падобна, заняло... Вочы пашырыліся, не раўнуючы дзве манеты. Аж захацелася яго локцем у бок стукнуць, як аднакласніка, што разявіўся на пірог на прылаўку пільнай гандляркі.

— О Мадона! — нарэшце прашаптаў граф і кінуўся зрываць з сябе капялюш, ледзь з парыком не зняў. — Angelo celeste*!

А Сафійка на чысцюткай італьянскай:

— Credo, signore mai visto gli angeli, perchй facilmente si confonde con la gente comune**.

Венецыянец ззяў ад захаплення, як пазалочаны стод на сонцы.

Халера... Добра, што Лёднік таго не бачыць.

Відаць, адчуўшы нядобрае, з рыдвана выйшла пані Саламея. Утарапілася ўладна ў авантурыста сінімі вялікімі вачыма.

— О, сіньёра, цяпер я разумею, у каго ўдалася нябёснай сваёй прыгажосцю ваша дачка!

— Наша дачка — яшчэ дзіця, васпан, — холадна прагаварыла Саламея. — Выбачайце, яна не мае доследу свецкага этыкету.

Італьянец рассыпаўся ў кампліментах накont бязвіннага чароўнага дзіцяці, якое, безумоўна, стане з цягам часу дыяментам якогась каралеўскага двара. Зараз жа і выбачацца пачаў, каяцца, што па неасцярожнасці ўчыніў такія нязручнасці шаноўным падарожным... Змусіў сваіх слуг дапамагаць Сцяцко і Карусю ў выратаванні кола.

Карусь выконваў працу неяк дзіўна. Увесь час яму трэба было пранесці штосьці цяжкое паўз графа, ды яшчэ ўпусціць у гразь, змусіўшы фацэта адскочыць ды вылаяцца. Пранціш кусаў вусы, каб не зарагатаць. Пушчанскі дзікун відавочна гатовы быў насадзіць нахабнага італійца на рагаціну, як мядзведзя, каб не лупіўся на Лёднічанку.

Між тым Мануцы фантаніраваў прапановамі, дзеямі і словамі так, што галава круцілася, як пасля бутэлькі такайскага. І гэткі ж непрыемны прысмак заставаўся. Каб экіпаж рамантаваць, пасажырам лепей выйсці. І чаму б не перачакаць у зручнай пазалочанай карэце, месца ў якой гаспадар з задавальненнем саступіць?

Урэшце Саламея і Сафійка сапраўды выйшлі з рыдвана — яго належала прыўзняць, каб вярнуць кола на месца. Вочы Мануцы гарэлі, як у галоднага ваўка, хацям нічым этыкету не парушаў. Не дурань.

А вось і з'яўленне цмока з пячоры... Прабачце, мізантрапічнага доктара з карэты. Тонкая, але дужая рука ўхапілася за дзвярны праём... Пранціш кінуўся падхапіць старэйшага сябра... Дзе там тое клятае крэсла на колах, з сабой прыхопленае? Але Чорны Доктар — што за дзіва? — выйшаў сам. Праўда, вельмі павольна і пахістваючыся. Саламея зараз жа падляцела падперці плячом упартага сужэнца... Ейны ўгневаны твар сведчыў, што адбылося тое, чаго яна баялася. На бледных звычайна шчоках доктара зараз гарэў румянак, у вачах з'явіўся шкляны ліхаманкавы бляск... Спажыў нарэшце свае сакрэтныя лекі, ганарлівец! Пранціш прыпомніў, як Лёднік ставіў на ногі аднаго старога езуіта, якому трэба было завесці каманду ў менскія сутарэнні, па езуіцкія скарбы. Скалечаны стары тады таксама расчырванеўся, бадзёра прайшоў куды трэба... А там зваліўся з сардэчным прыступам.

Мануцы падляцеў да доктара з прывітаннямі і выбачэннямі. Ці моцна яму дакучае ягоная... чорная меланхолія? Апошнія словы Мануцы вымавіў з нейкай асаблівай інтанацыяй, нібыта меў на ўвазе нешта зусім іншае.

Лёднік у адказ выключна ветліва пацікавіўся, як пачуваюцца чароўная жонка графа і анёлачак-сынок, ці не моцна дакучае бацьку бязвіннымі немаўлячымі пракудамі? Мануцы вытрымаў пранізлівы цёмны позірк, але не спапяліўся, а таксама адвесіў нешта выключна ветлівае з атрутай на дне.

А потым, калі доктар, сцяўшы зубы, садзіўся ў пазалочаную карэту — ну дурноцце ж было стаяць у гразі, на ветры — Мануцы раптам учыніў нешта незразумелае... Тупнуў нібы выпадкова па нейкай трэсцы, тая падкінула ў паветра сасновую шышку... Шышка са свістам ляцела проста Лёдніку ў патыліцу. Не даляцела — распалася на дзве паловы, акуратна рассечаная доктаравай шабляй. Усё адбылося хутка, як вокам змігнуць. Пранціш толькі маланкавы бляск ляза заўважыў. Лёднік, злосны, як шэршань, хаваў шаблю ў похвы. А вось Мануцы быў дужа задаволены. Значыць, адмыслова зладзіў палёт шышкі... Праверыць навыкі старога воя. І не звінаваціш спрытнюгу.

Сафійка пад суровым бацькоўскім прыглядам сядзела ў графскай карэце ціха, як мыш. Лёднік трымаўся за шаблю і пабліскваў моўчкі вачыма з глыбі чужой карэты. Пранціш сумлення займаў графа пустой свецкай балбатнёй, ад якой абодва не атрымлівалі ніякага задавальнення. Пані Ізабэла Чартарыйская зноў пасварылася з мужам, але дамаглася згоды і збудавала ў Лазенках цэлую вёску хацін з саламянымі дахамі, дзе прымае гасцей, апранутая ў пейзанку. Зараз у Гародні пачнуцца рэдуты, кажуць, на іх прыездзе сам расійскі канцлер Рапнін, амарат пані Ізабэлы. Паэт Станіслаў Трамбецкі напісаў паэму ў гонар каралеўскага пляменніка пана Станіслава з нагоды, што той усіх сваіх сялян з маёнтка Альшэўцыў сабраў на баль і абвесціў, што вызваляе ад прыгону і аддае ў валоданне зямлю. Вялікі прагрэсіст пляменнік караля! Не дарэмна кажуць, што кароль менавіта яго рыхтуе ў свае пераемнікі. Сваіх жа законных дзяцей мець не можа... Тс-с, гэта таямніца, але такая была дамова з расійскай імператрыцай узамен за трон...

Пранціш слухаў, ківаў з самым разумным выглядам і намагаўся не выказваць ні ўхвалы, ні насмешкі.

Нарэшце кола рыдвана стала на месца. Сафійку суправадзілі на месца бацькі. Мануцы кланяўся і лапатаў, што яму па дарозе з шаноўнымі Лёднікамі... І, дарэчы, ён добра знаёмы з чорнай меланхоліяй і ўмее з ёй ладзіць.

Пранціш адышоў да пазалочанай карэты, каля задняга кола якой завіхаліся слугі, паклікаў насупленага Каруся, шапнуў ціхенька:

— Здаецца, графскую карэту хутка таксама направяць... Трывалыя ў яе колы, як думаеш?

— Ды хліпкія зусім... — задумліва прамовіў разумны хлопец Карусь. Абышоў няспешна карэту, нахіліўся над яшчэ цэлым колам — Пранціш пастараўся стаць так, каб прыкрыць яго спінай... Нешта ціха грукнула... Вырвіч кінуў хуткі пагляд: пушчанскі дзяцюк хаваў нешта ў рукаве.

Ну вось цяпер можна развітвацца!

Рыдван ірвануў з месца, як запрэжаны гарцукамі. Вырвіч пачуў, як Мануцы крычыць на слуг, спадзеючыся не адстаць ад экіпажа з гэткімі цікавымі пасажырамі... Ну, далёка не ад'едзецца. Карусь — сапраўдны мацак, выцягнуў з восі чаку...

---

* Чысты анёл! (італ.)

** Думаю, сіньёр ніколі не бачыў анёлаў, таму што блытае іх са звычайнымі людзямі (італ.).

---

Тэатральная афіша

# ПРА КАХАННЕ І НЕ ТОЛЬКІ...

**У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа рыхтуюцца да 95-га юбілейнага сезона. Сёлета гледачы прыемна здзіўлены вялікай колькасцю прэм'ер на розны густ.**

Напрыклад, добра прыняла публіка «міні-серыял» для мужчыны і жанчыны з інтрыгуючай і заманлівай назвай «Асенні rock'n'roll». Аўтар п'есы — ізраільскі драматург расійскага паходжання Міхаіл Хейфец. Рэжысёр-пастаноўшчык — Аляксандр Дольнікаў — масквіч. Раней працаваў у тэатрах Брэста, Віцебска, Магілёва. Зараз супрацоўнічае з рознымі тэатральнымі калектывамі. Дарэчы, шэсць гадоў таму паставіў у віцебскім тэатры на камернай сцэне спектакль "Я вольны!" па рамане вядомай бельгійскай пісьменніцы Амелі Натомб «Касметыка ворага»...



**Фрагменты спектакля «Асенні rock'n'roll».**

Летам гледачу прыйшлася даспадобы і прэм'ера камедыі-фарса «Каханне і падаткі» па п'есе амерыканскіх драматургаў Уільяма Ван Занта і Джэйн Мілмар. Кароткі змест спектакля: на што толькі не пойдзеш, каб сэканоміць грошы на падатках! Дзеля гэтага адзін з галоўных герояў прадставіў падаткавіку свайго найлепшага сябра ў вобразе... каханай жанчыны. І такім убачыла хлопца яго каханая, а таксама палюбоўніца, якая — хм... нявеста... хітрага злодзея, што вырашыў падмануць дзяржаву. Нейкім чынам сюжэт нагадвае фільм «Добры дзень, я ваша цётка!» Рэжысёр-пастаноўшчык Генадзь Мушперт, ён жа — мастацкі кіраўнік Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Майстар ажыццявіў таксама пераклад п'есы, музычнае афармленне.

«Метро», п'еса сучаснага беларускага драматурга Аляксандра Савухі, натхніла рэжысёра Андрэя Жыгура. Ён жа аўтар сцэнаграфіі і касцюмаў. У спектаклі паспяховы і досыць амбіцыйны, ганарысты бізнесмен Дзіма пасля сваёй клінічнай смерці ў метро трапляе ў невядомы вялікі падземны горад, адкуль дарэмна шукае выхад. Не адразу разумее, што гэта ёсць не што іншае, як пекла...

А ў верасні адбудзецца першы паказ спектакля «Шлюб па-італьянску» па славутай п'есе італьянскага драматурга Эдуарда дэ Філіпа «Фелумена Мартурана». Рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі Юрый Пахомаў, раскажа гісторыю пра тое, як часта блізкія людзі, якія жывуць разам доўгі час, нічога адно пра аднаго не ведаюць. Італьянец напісаў п'есу ў 1946 годзе. Пастаноўка мела такі поспех, што акцёры былі запрошаны рымскім Папам Піем XII на аўдыенцыю. П'еса і сёння ставіцца ў тэатрах многіх краін свету, некалькі разоў была экранізаваная. Вядома, што здымкі самага вядомага фільма «Шлюб па-італьянску» ажыццявіў Віторыё дэ Сіка, галоўныя ролі сыгралі Сафі Ларэн і Марчэла Мастраяні.

Нядаўна пастановай Міністэрства культуры тэатру чарговы раз быў пацверджаны высокі статус нацыянальнага. Коласаўцаў ведаюць далёка за межамі Беларусі. Яны стараюцца захоўваць традыцыі і не адставаць ад трэндаў часу. І ім гэта ўдаецца добра.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**фота аўтара.**

# УЧОРА І ЗАЎТРА СЯДЗІБЫ РЭЙТАНАЎ


Сядзіба Рэйтанаў пабудавана з лістоўніцы — каштоўнай драўніны, якая з цягам часу становіцца толькі больш трывалая.

**Хрэстаматыйная фраза, знаёмая кожнаму, хто без двоек скончыў сярэднюю школу, — наконт «народнай тропы», якая «не зарастет» — мне яшчэ ў дзяцінстве здавалася крыху, так бы мовіць, перабольшанай. Як і куды торыць сваю сцежку любы народ (наш беларускі — у тым ліку), наўрад ці можна прадказаць загадзя. Туды, дзе ўсё выкладзена пліткай і куды возяць арганізаваныя экскурсіі школьнікаў? Спрэчнае пытанне... Зрэшты, напэўна, гэта суб'ектыўна. Проста хачу сказаць, што ў сядзібу Рэйтанаў у Грушаўцы, што пад Ляхавічамі, народная сцежка і праўда не зарастае. Сюды любіла ездзіць моладзь, якой хацелася даведацца больш пра гісторыю сваёй краіны, дваццаць гадоў таму. Ездзіць і цяпер.**

Месцы тут і сапраўды дзіўныя, нават містычныя: гатычная капліца-пахавальня на мяжы лесу і поля, «лесвіца ў неба», што да яе вядзе, сама сядзіба — вялікі, змрочны драўляны дом на высокім падмурку — і звязаная з ёй прыгожая і сумная гісторыя. І вось нарэшце сядзібу Рэйтанаў рэстаўрыруюць. Зразумела, мы вырашылі там пабываць і даведацца, што будзе далей з адным з самых (як мне здаецца) цікавых гістарычных аб'ектаў нашай краіны.


Пахавальня роду Рэйтанаў — мініяцюрная копія касцёла святой Кацярыны ў Кракаве.

## ГРУШАЎКА, ЯНА Ж ГРОШАЎКА

Гісторыя Ляхавіч і навакольляў багатая на славутых людзей і гістарычныя падзеі. Тут нарадзіўся, жыў і памёр Фёдар Еўлашоўскі, першы беларускі мемуарыст, асабісты сябар двух каралёў Рэчы Паспалітай — Стэфана Баторыя і Жыгімонта Вазы. Тут, на беразе ракі Ведзьмы, калісьці стаяла Ляхавіцкая фартэцыя — адно з найбуйнейшых абарончых збудаванняў Рэчы Паспалітай. Тут жа непадалёк размяшчаўся маёнтак Вошкаўцы, які належаў вядомаму філосафу Фларыяну Бохвіцу і куды не раз прыязджала славутая пісьменніца Эліза Ажэшка, якая сцвярджала, што прыгажэйшых месцаў не бачыла. Прыёмы ў маёнтку Вошкаўцы збіралі плеяды выдатных музыкантаў, акцёраў і літаратараў. Тут, пад Ляхавічамі, паўстанцы Каліноўскага ўступілі ў сваю апошнюю бітву — на яе месцы сёння ўсталяваны мемарыяльны камень.

Але, мабыць, самае вядомае месца ў гэтым рэгіёне — усё ж сядзіба Рэйтанаў у Грушаўцы.

Грушаўкай вёска стала ўжо пры савецкай уладзе. Да гэтага была Грошаўкай — таму што тут сяляне жылі багата. Апошні з Рэйтанаў, пан Юзаф, быў прыхільнікам прагрэсу. Ездзіў на адным з першых у рэгіёне аўтамабіляў. Каб палегчыць сялянскую працу, купіў фабрычную жнявярку. Зажынкі і дажынкі на землях пана Юзафа Рэйтана святкаваліся ў адзін дзень. Наймалася дастатковая колькасць работнікаў, каб на працягу светлавога дня ўбраць увесь ураджай. Пакуль ішлі работы, гатаваўся пачастунак, а ўвечары за сталы сядалі разам і пан, і работнікі. За працу пан Рэйтан плаціў шчодра: хто хацеў, таму золатам, хто хацеў — збожжам і сельгаспрадукцыяй. Бяздзетныя пані Алёна і пан Юзаф актыўна займаліся дабрачыннасцю: прытулілі каля 30 сірот, далі ім адукацыю, дзячатам — годны пасаг.

Пан Юзаф памёр у 1910 годзе. Захавалася сведчанне аб яго пахаванні. Жалобная працэсія была шматлюдная. Ішлі тут і простыя людзі, і дзеці-сіроты, якіх апекавалі Рэйтаны, і мяшчане з Ляхавіч ды іншых мястэчак, і шляхта. Згодна са старадаўнім звычаем, падчас пахавання быў разбіты герб роду: на магіле апошняга мужчыны з рыцарскага роду разбіваўся радавы герб — у знак таго, што род памёр, перастаў існаваць.

Пані Алёна перажыла мужа і дажыла да рэвалюцыі. Пасля прыходу савецкай улады яе адправілі на прымусовыя работы ў Сібір. Легенда кажа, што выратавала сваю былую пані, вывезла на радзіму нелегальна, сялянка былой рэйтанаўскай вёскі. Але да родных мясцін пажылая пані не даехала, памерла ў дарозе ад тыфу. Дзе супакоены яе прах, невядома.

Аднак у першую чаргу сядзібу Рэйтанаў звязваюць са значна ранейшымі падзеямі — з імем Тадэвуша Рэйтана, дэпутата вырашальнага «сойма разборчага» 1773 года, які спрабаваў перашкодзіць першаму падзелу Рэчы Паспалітай.

## ТОЙ САМЫ РЭЙТАН

Рэйтанаў адны гісторыкі называюць выхадцамі са Швецыі, іншыя — родам з нямецкіх каранямі. У 1659 годзе за верную службу каралю Рэчы Паспалітай Марцін Рэйтан атрымаў маёнтак Бяроза каля Полацка. У далейшым прадстаўнікі роду займалі важныя дзяржаўныя пасады і радніліся з магнатамі. Так, брат маці Тадэвуша Рэйтана ўзначальваў уніяцкую царкву Рэчы Паспалітай.

У Польшчы Тадэвуша Рэйтана называюць нацыянальным героем. У Кракаве ўсталяваны помнік гэтаму чалавеку. Сам жа ён, паводле гістарычных крыніц, называў сябе ліцвінам (гэта значыць прадстаўніком Вялікага Княства Літоўскага, ці, як цяпер бы сказалі, выхадцам з беларускіх земляў): «Хто назаве мяне не ліцвінам, той мяне абразіць». Пра жыццё гэтага чалавека да сойма 1773 года вядома не надта шмат. Захаваліся сведчанні пра тое, што Тадэвуш Рэйтан быў патрыётам, які горача любіў сваю радзіму. І быў ён бескампрамісны ў гэтай любові.

— Каханнем усяго яго жыцця была пані Еўлашоўская, — расказвае **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ляхавіцкага райвыканкама Ніна ПРЫХАЧ.** — Але разам яны быць не змаглі. Тадэвуш Рэйтан паехаў сватацца да каханай, быў добразычліва прыняты, але, праходзячы па пакоях, убачыў у яе доме партрэт Пятра Першага. Гэта прымусіла Рэйтана адмовіцца ад сватаўства: «Не магу ўзяць жонку з таго дома, дзе праслаўляюць нашага ворага». Вядома, што на працягу жыцця ён так і не ажаніўся.

З'яўляючыся пасламі ад Навагрудскага павета на сойме Рэчы Паспалітай, 21 красавіка 1773 года Тадэвуш Рэйтан адзін з нямногіх спрабаваў адстаяць цэласнасць дзяржавы падчас яе першага падзелу. У апошні, трэці дзень работы «сойма разборчага», які праходзіў у Варшаве, дэпутаты павінны былі ратыфікаваць падзел зямель Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Расіяй і Аўстрыяй.

— Гэта было ўжо проста падпісанне дакументаў, сам падзел, па сутнасці, адбыўся раней, — тлумачыць Ніна Прыхач. — Рэйтан і яго нешматлікія прыхільнікі спрабавалі выкарыстаць права ліберум вета — прынцып парламенцкага ладу ў Рэчы Паспалітай, які дазваляў любому дэпутату спыніць абмеркаванне пытання ў сойме, выступіўшы супраць. Аднак рашэнне аб падзеле Рэчы Паспалітай сойм усё ж прыняў большасцю галасоў — менавіта тады і адбылася адмова ад прынцыпу ліберум вета. І тады Тадэвуш Рэйтан лёг у дзвярах упоперак выхаду з залы са словамі: «Тапчыце мяне, не тапчыце Радзіму!» Гэты момант адлюстраваны на славутай карціне «Рэйтан. Заняпад Польшчы» — думаю, гэтае палатно бачылі і змогуць успомніць многія. Чаму ён так зрабіў? Лічылася: пакуль дэпутаты знаходзяцца ў сойме, рашэнне не прынята канчаткова. Рэйтан стараўся не дапусціць таго, каб прадстаўнікі шляхты, надзеленыя правам вырашаць лёс дзяржавы, пакінулі залу, бо ён спадзяваўся, што іх яшчэ ўдасца пераканаць не згаджацца на падзел краіны. У тыя часы лічылася, што пераступіць цераз шляхціца — значыць праявіць непавагу ў цэлым да дваранства і дваранскага гонару. І дэпутаты сапраўды аказаліся перад нялёгкім выбарам. Але нават адчайныя меры ні да чога не прывялі. Падзел зямель Рэчы Паспалітай сойм ратыфікаваў.

Звесткі пра апошнія гады жыцця Тадэвуша Рэйтана скупыя і заблытаныя. Вядома, што сваякі абвясцілі яго вар'ятам і што ён памёр у 1780 годзе, скончыўшы жыццё самагубствам.

— У наш час сказалі б, што ў яго была глыбокая дэпрэсія. Падзел Рэчы Паспалітай стаў для гэтага чалавека моцным узрушэннем, — тлумачыць суразмоўніца. — Ён не быў вар'ятам — але ён заклікаў да паўстання, што пагражала сям'і пазбаўленнем уласнасці і ссылкай. Так што бяспечней за ўсё для прадстаўнікоў роду было абвясціць гэтак рашуча настроенага сваяка вар'ятам.

У апошнія гады Тадэвуш Рэйтан вёў адасоблены лад жыцця. Ці скончыў ён самагубствам? Гісторыкі спрачаюцца наконт гэтага і сёння. З аднаго боку, месца яго пахавання невядома — самагубцаў не хавалі на могілках. З іншага, гісторык і краязнавец Зміцер Юркевіч на падставе гістарычных дакументаў і лістоў сваякоў Тадэвуша Рэйтана кажа пра тое, што яго смерць стала вынікам няшчаснага выпадку.

— У Грушаўцы прымалі расійскага генерала — ён прыбыў па маёмасных справах, — расказвае Ніна Прыхач. — Баючыся, што Тадэвуш Рэйтан выкліча госця на дуэль (або проста засячэ шабляй), яго замкнулі ў афіцыне — гаспадарчай пабудове з рашоткамі на вокнах, бо падобныя паводзіны прадстаўніка роду мелі б разбуральныя наступствы для сям'і. Спрабуючы выбрацца, Тадэвуш разбіў шкло, моцна парэзаўся і памёр ад страты крыві. На момант смерці яму было 40 гадоў.

## ЛЕСВІЦА Ў НЕБА

Пахавальня роду Рэйтанаў — мініяцюрная копія касцёла святой Кацярыны ў Кракаве — была пабудавана апошнім прадстаўніком роду, Юзафам, у пачатку XX стагоддзя. Там усяго два пахаванні — сам пан Юзаф і яго сваячка, Марыя Грабоўская. Багатае на войны дваццатае стагоддзе не пашкадавала помнік: цяпер і тонкай работы мармуровую плітку на падлозе склепа, і рознакаляровыя вітражы вокнаў можна сабе толькі ўяўляць. Але ёсць асаблівасці, якія немагчыма знішчыць. Па-ранейшаму раніцай першы сонечны прамень падае на капліцу (так арыентавана пабудова) раней, чым на дрэвы побач і ўсе астатнія будынкі навокал. І па-ранейшаму вядзе да капліцы незвычайная алея — «лесвіца ў неба». На гэтай алеі лістоўніцы высаджаны «па росце» і больш чым за стагоддзе так і не зраўняліся па вышыні. Самыя высокія растуць каля капліцы.

— Назва «лесвіца ў неба» прыжылася з лёгкай рукі нашага мясцовага краязнаўца, вядомага мастака Сяргея Чарановіча, — распавядае суразмоўніца. — Дарога да капліцы абсаджаная лістоўніцамі, якія растуць нібы «прыступкамі». Хвойныя расліны па старажытнай славянскай традыцыі лічацца дрэвамі мёртвых. У першую чаргу елка ў славян — дрэва смерці. Да гэтага часу ў нас у рэгіёне дарогу перад пахавальнай працэсіяй пасыпаюць хвояй. Лістоўніц у Беларусі няшмат, але яны таксама — хвойнікі.

Сімвалічная і колькасць дрэў. Лічба 2 у нумаралогіі звязана са смерцю, таму дрэвы высаджаны парамі. Алея складаецца з 12 пар дрэў. Сёння гэтае пасланне гісторыкі расшыфроўваюць так: лічба 4 складаецца з дзвюх двоек і сімвалізуе няшчасце. Лічба ж 3 — сімвал завершанасці і абяцанне шчасця. «Лесвіца ў неба» сімвалізуе пераход ад поўнага нягод і нястач знаходжання душы на зямлі да лепшага, нябеснага жыцця.

## ШТО БУДЗЕ З СЯДЗІБАЙ?

Драўляны дом, рэстаўрацыя якога пачалася сёлета, быў пабудаваны ў XIX стагоддзі на месцы старога каменнага дома. Сродкі на правядзенне першай чаргі работ па рэканструкцыі помніка выдзелены Еўрасаюзам у рамках міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

— Праграма прадугледжвае адначасовае аднаўленне двух гістарычных аб'ектаў у дзвюх дзяржавах. З выдзеленых 2,5 мільёна еўра палова ўкладзена ў аднаўленне старадаўняга маёнтка на тэрыторыі Гміны Пухачуў (Польшча), а палова сродкаў пойдзе на аднаўленне сядзібы Рэйтанаў і кансервацыю пахавальні роду, — кажа Ніна Прыхач. — Таксама на рэстаўрацыю сядзібы выдзелена 140 тысяч еўра з абласнога бюджэту.

— Рэстаўрацыйныя работы праводзяцца сумесна з Інстытутам гісторыі НАН і ААТ «Брэстрэстаўрацыя», — кажа **кіраўнік праекта Андрэй КАЗЮТА.** — Кожную дэталь пабудовы мы абследуем, тое, што можна захаваць, — захоўваем. Тое, што прыйшло ў непрыдатнасць, замяняем на аналагічную дэталь з ідэнтычнага матэрыялу. Справа ў тым, што пры будаўніцтве сядзібы выкарыстоўваліся элітныя сарты драўніны — напрыклад, брытанскі дуб або тая ж лістоўніца — унікальнае дрэва, пабудовы з якога з гадамі становяцца толькі больш трывалыя (вядома, што Венецыя стаіць на сваях з лістоўніцы). Зразумела, пры аднаўленні будуць выкарыстаны мясцовыя сарты драўніны. Але ў цэлым мы імкнёмся максімальна захаваць гістарычнасць пабудовы.

Завяршэнне першай чаргі рэканструкцыі запланавана на 2021 год. Калі сядзібы комплекс будзе цалкам адноўлены, пакуль прагназаваць немагчыма. Пасля завяршэння работ тут будуць экспазіцыйныя залы музея, памяшканні для правядзення творчых канферэнцый, філіял мясцовай школы мастацтваў і выставачныя залы жывапісу — наваколлі Грушаўкі літаральна просяцца на палатно. Таксама плануецца, што ў будынку сядзібы будуць пакоі для мастакоў, якія змогуць прыязджаць у Грушаўку на эцюды.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Спадчына

# У ЧАКАННІ МУЗЕЯ І З НОВЫМ АЛТАРОМ

## Старажытны Брыгіцкі манастыр XVII стагоддзя ў Гродне рыхтуецца прадставіць свае экспанаты ў новай музейнай зале

**Пакуль экспазіцыя знаходзіцца ў чатырох невялікіх пакоях падвальнага памяшкання. Тут захоўваюцца рэчы, якія некалі належалі манахіням-брыгіткам, а затым — назарацянкам. Сярод экспанатаў — кнігі, абрадавыя і бытавыя прадметы, карціны і нават сельскагаспадарчыя прылады. Пасля таго як у манастыры завершыцца рэканструкцыя, усе рэчы трапяць у прасторную і прыстасаваную для гэтага залу.**

### Там быў фамільны склеп...

Сапраўды, захоўваць старажытныя прадметы, якім да трохсот гадоў, у падземным склепе даволі складана. Для таго каб падтрымліваць мікраклімат, тут працуе спецыяльны кандыцыянер. Але пакойчыкі вельмі малыя, таму групе з 20-30 чалавек тут цеснавата. Ды і святла не хапае, каб добра разгледзець усе экспанаты. А яны насамрэч даволі цікавыя.

Каб іх убачыць, трэба спусціцца па крутой лесвіцы ў гэты самы склеп. Падвал цалкам аднаўлены, атынкаваны. Але адзін пакой застаўся ў першапачатковым выглядзе. Яго ачысцілі адмысловым растворам, які дазволіць доўгі час захоўваць памяшканне ў такім стане, і дасць уяўленне, як выглядаў склеп падчас пабудовы. Тут відаць старажытную кладку, у асноўным цагляная, хоць фундамент у тыя часы звычайна клалі з камянёў, бо тады ён больш трывалы. Аказваецца, цэгла выраблялася на самой будоўлі і была высокай якасці. Цікава, што кладка сыходзіцца зверху ў адну лінію без усякіх падпорак. Разам з цаглінамі можна ўбачыць яшчэ і вялікія камяні, бо ўсё падзямелле — гэта фундамент касцёла. Для чаго зроблены гэты склеп? Паколькі тэрыторыя комплекса была абнесена высокай мураванай агароджай, а сёстры-брыгіткі вялі адасобленае жыццё, падвал стаў месцам іх пахавання. Тут знаходзіліся і астанкі заснавальнікаў манастыра: князёў Весялоўскіх і іх прыёмнай дачкі Грызельды — менавіта яна прасіла бацькоў пабудаваць у Гродне гэты манастыр. Пасля вайны астанкі былі вывезены, а куды — невядома. Захавалася толькі частка надмагільных пліт.

### Храм — дыспансер — храм

Увогуле Брыгіцкі манастыр — гэта цэлы комплекс у гістарычнай частцы горада. У яго складзе — сам манастыр брыгітак, касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Панны Марыі і драўляны лямус. Захавалася частка былой высокай сцяны і адной вежы. А вось прыгожая брама да нашых часоў не дайшла, як і высокая вежа-званіца. Яе знеслі, каб пашырыць дарогу. Нейкім цудам ацалеў звон ад вежы. Ён нават мае ўласнае імя — Себасцьян. Цяпер звон уладкаваны каля касцёла, і кожны, хто пажадае, можа пазваніць у яго.

За амаль 370-гадовую гісторыю тут адбылося нямала змен. Пасля ордэна брыгітак у пачатку XX стагоддзя насельнікамі манастыра сталі назарацянкі. У 1950-х гадах манастырскі комплекс стаў уласнасцю горада, тут уладкавалі дзіцячы сад, а праз некаторы час былыя манастырскія пакоі абсталявалі пад псіханеўралагічны дыспансер. Але было зразумела, што помнік архітэктуры XVII стагоддзя патрабуе рэканструкцыі. Гэтую місію вырашыла ўзяць на сябе Гродзенская каталіцкая епархія. Ёй і быў перададзены Брыгіцкі манастыр роўна 30 гадоў таму. Дарэчы, справа гэтая была не такая простая. Пасля ўзгаднення з мясцовымі ўладамі прадстаўнікі епархіі ездзілі ў Маскву, дзе атрымалі канчатковую згоду. Фотаздымкі з навейшай гісторыі манастыра складаюць невялікую экспазіцыю ў адным з падвальных пакояў. Пасля рэканструкцыі яны таксама зоймуць месца ў аднаўленым памяшканні.







### Захаваць аўтэнтыку

Трэба сказаць, што татальная рэканструкцыя пачалася не адразу. Асноўныя работы распачалі 15 гадоў таму. За гэты час адрамантаваны касцёл. З-пад тынкоўкі ўзнавілі зграфіта — чорна-белы ўзорны «пояс» па перыметры касцёла.

Тую частку вежы, якая захавалася, таксама аднавяць. А вось некаторыя тэхнічныя пабудовы і гаражы будуць знесены. Мяркуецца надаць былым пакоям аўтэнтычны выгляд, бо многае за гэты час перабудавана і ў самым манастыры — былі зроблены перагародкі, павялічаны аконныя праёмы, з'явіліся новыя дзверы.

У манаскіх келлях будзе гасцінічны комплекс. Людзі, якія прыедуць паглядзець горад, змогуць застацца на некалькі дзён, зняць сабе пакой. Гэта будуць пакоі, стылізаваныя пад тыя самыя келлі манахінь. У адной з частак хола пад высокай шкляной столлю размесцяць музей.

### Ад глобуса да сеялкі

Што тут можна будзе ўбачыць? Вядома, усе тыя экспанаты, што цяпер знаходзяцца ў падвале. Пра іх расказала гід-валанцёр Марта Марцішэўская. Яна звярнула ўвагу на манаскую бібліятэку. Сапраўды, захавалася шмат старых кніг — амаль дзве шафы. Гэта ў асноўным рэлігійная літаратура на лацінскай, французскай, польскай і рускай мовах. Ёсць і навуковая. Захаваўся нават стары глобус. Менавіта сёстры-назарацянкі арганізавалі ў Гродне школу для дзяўчынак, якая потым стала гімназіяй. Зараз гэта адзін з галоўных карпусоў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У падвале захоўваецца шмат ікон і карцін з вобразамі святых. Вядома толькі адна аўтарка — гэта настаяцельніца сясцёр-назарацянак, хоць яе работы і не падпісаны. Некаторыя карціны патрабуюць рэстаўрацыі, на іх ёсць парэзы і іншыя дэфекты.

У падвале знаходзяцца і некаторыя прадметы з драўлянага лямуса — гаспадарчай пабудовы, дзе захоўваліся прылады працы і харчовыя запасы. Напрыклад, старажытная сеялка, дзе паміж двума коламі прычэплена каробка для насення. Дарэчы, сам лямус, пабудаваны без адзінага цвіка, цяпер таксама на рэканструкцыі. Ідуць вельмі складаныя работы па яго захаванні — давялося нават з дапамогай крана падымаць будынак, каб ён стаяў роўна. Работы вядуцца сумесна з польскім бокам.

Адным з каштоўных экспанатаў музея лічыцца адзенне, у якім сюды прывезлі з Ватыкана мошчы святога Клімента. Ён быў воінам рымскай арміі і загінуў за хрысціянскую веру. Папа Рымскі падараваў мошчы гродзенскаму старасту, каб горад меў свайго ахоўніка. Цяпер адзенне знаходзіцца ў музеі, а самі мошчы ў рыцарскіх даспехах утрымліваюцца ў шкляным саркафагу каля алтара касцёла.

У падвальных пакоях можна ўбачыць некалькі сакратэраў, стары тэлефон, канцылярскія і медыцынскія прылады. Усе гэтыя рэчы захоўваліся самімі манахінямі. Пры передачы манастыра Гродзенскай каталіцкай епархіі прадметы вярнулі. Праўда, не ўсе. Некаторыя сталі экспанатамі Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі. Значная колькасць ікон і выяў святых пасля рэстаўрацыі ў Эрмітажы знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску, у тым ліку і партрэты сям'і Весялоўскіх — фундатараў касцёла.

Брыгіцкі манастыр папулярны сярод турыстаў. А гіды-валанцёры ахвотна праводзяць экскурсіі для ўсіх ахвотных. У мінулую нядзелю, напрыклад, экскурсія стала часткай урачыстасці ў храме. У гэты дзень адбылося асвячэнне новага алтара, устаноўленага замест драўлянага (той даўно знік). Алтар зроблены пад мармур у тэхніцы венецыянскай тынкоўкі з дзвюма залатымі калонамі. Што датычыцца музея, то канкрэтных тэрмінаў у касцёле назваць не бяруцца. Вядома адно — яго праект падрыхтаваны і чакае свайго здзяйснення.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# БЕЗ ЦЯПЛА НЕ ЗАСТАНЁМСЯ

**У Беларусі заканчваецца падрыхтоўка да чарговага ацяпляльнага сезона. Аварыі на аб'ектах жыццезабеспячэння — лініях электраперадачы, кацельнях, трубах — у гэты час асабліва вострыя. Улетку непаладкі з той жа кацельняй не такія прыкметныя. Жыхары дамоў з цэнтралізаваным гарачым водазабеспячэннем і так застаюцца на два тыдні без яго праз планавае адключэнне. Не вельмі прыемна, але не крытычна. А вось ва ўмоўныя мінус дзесяць сядзець без цяпла — так сабе перспектыва.**



Канешне, ідэальную страхоўку ад усіх імаверных здарэнняў вынайсці немагчыма. Затое можна зрабіць іншае — ліквідаваць іх наступствы як мага хутчэй. А каб навучыцца гэта рабіць у высокім тэмпе, патрэбны адмысловыя «прагоны» сітуацыі. Вось таму ў пасёлку Зялёны Бор пад Смалявічамі прайшлі вучэнні па рэагаванні на аварыі і надзвычайныя сітуацыі на аб'ектах жыццезабеспячэння. У іх удзельнічалі як ратавальнікі, так і камунальнікі, энергетыкі і прадстаўнікі газавай службы. Каардынаваў іх дзеянні штаб па ліквідацыі надзвычайнай сітуацыі на чале з намеснікам старшыні Смалявіцкага райвыканкама Ігарам Кузняцовым.

Пэўна, такой колькасці спецыялістаў, якія ліквідавалі адну аварыю за другой, невялічкі пасёлак не бачыў ніколі. Будзем спадзявацца, што рэальнай нагоды для гэтага ніколі і не настане. Дзеянне спачатку разгарнулася блізу мясцовай кацельні. Яна дае цяпло больш чым у 40 дамоў, сярод якіх — амаль тры дзясяткі шматпавярховікаў, школа, дзіцячы садок, сельвыканкам, лазня, дом культуры... Агулам яна абаграе каля 2300 чалавек. Па задуме вучэнняў, на адну з апор ліній электраперадачы, якая сілкуе кацельню, упала дрэва. Пры гэтым яно зачапіла чалавека, які праходзіў побач. Медыкі аказалі яму неабходную дапамогу. Электрычнасць жа на перыяд рамонту выпрацоўвала дызель-генератарная ўстаноўка.

Гарачая вада і цяпло павінны паступаць незалежна ад любых абставін. І калі што, у ход павінен уступіць рэзерв. Аднак вось незадача — кацёл, які працуе на цвёрдым паліве, выйшаў са строю. Некрытычна — на гэты выпадак ёсць рэзервовы, на газе. Ды вось толькі ў спешцы не да захавання патрэбнага тэхналагічнага працэсу. Як вынік — выбух. Кацельнае абсталяванне пашкоджана так, што не можа працаваць. Ды калі б і магло, то дзе? Бо выбуховай хваляй вынесла вокны і дзверы ў памяшканні. Там былі два супрацоўнікі кацельні. А людзі па-ранейшаму застаюцца без цяпла.

На месца падзей прыехалі аварыйныя брыгады, якія знайшлі пацярпелых, перадалі іх медыкам і разгарнулі спецыяльную блочна-модульную кацельню. Перасоўны комплекс стане генерыраваць цяпло, пакуль не будзе адрамантаваны будынак і асноўныя рабочыя катлы. Нарматыўны час яго пуску — да 50 хвілін.

— Падобныя вучэнні праводзяцца ў кожным раёне, — зазначыў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ЛАПАНОВІЧ.** — У іх аснову закладваюцца максімальна складаныя сцэнарыі развіцця неспрыяльных падзей. Гэта трэба для таго, каб праверыць на трываласць дзейнасць дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый.





— Адначасова пасёлак без цяпла не застанецца, — запэўніваюць спецыялісты Смалявіцкай ЖКГ. — У нас ёсць магчымасць падтрымліваць ціск у сістэме цеплазабеспячэння пры дапамозе адмысловай помпы.

З двух стваloў ратавальнікі тушаць будынак, з вокнаў якога валяць клубы дыму. Да тарца кацельні пад'ехалі аўтавышкі. Унутры пажар ужо патушаны, але полымя паспела падпаліць дах. Калі будынак шчодра паліваюць вадой, то зверху гасяць агонь пенай. Пашкоджанні з вышыні зняла камера беспілотніка.

А тым часам новая бяда — парвала трубу цеплатрасы...

Вось і ў нашым выпадку падчас правядзення земляных работ у месцы парыву цеплатрасы коўш пашкодзіў і газавую трубу. Утварыўся свішч. Таму камунальнікі павінны паказаць, як яны аператыўна працуюць у такіх сітуацыях — накласці бандаж на газавую трубу, раскапаць цеплатрасу, адпампаваць адтуль ваду, заварыць трубу.

Таксама спецыялісты рэгулярна замяралі загазаванасць пры дапамозе лазернага дэтэктара. Ды і пра забеспячэнне спецыялістаў, якія вядуць рамонт, таксама трэба паклапаціцца. Таму для іх разгарнулі спецыяльны пункт, дзе можна было пагрэцца і пад'есці.

Вынікі вучэння абазначыў **намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр КРУЧАНАЎ**.

— Алгарытм правільны, а дзеянні прадстаўнікоў розных ведамстваў і арганізацый вельмі зладжаныя, — зазначыў ён. — Так, ёсць рэчы, якія спрагназаваць і папярэдзіць не можа ніхто. Але для таго і патрэбна зладжанасць, каб аператыўна адрэагаваць на праблему і выпрацоўваць новыя падыходы для яе вырашэння.



**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Продавец – ОАО «ОРС Гомель»**
**Оператор – «Единая система электронных торгов»**
**torgi.gov.by**

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**Лот № 1.** Изолированное помещение, инв. № 350/D-148917, расположенное по адресу:
г. Гомель, ул. Мазурова, 42, общая площадь 153,6 кв. м (назначение – торговое помещение, наименование – помещение магазина). Недвижимое имущество обременено залогом банка.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 277 697,73 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости – 27 769,77 бел. руб.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение, инв. № 350/D-166327, расположенное по адресу:
г. Гомель, ул. Советская, 97/4, общая площадь 69,3 кв. м (назначение – помещение здравоохранения). Недвижимое имущество обременено залогом банка.
**Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001001120, площадью 0,2642 га (доля в праве 73/1000).
Договор аренды № 3622 от 31.03.2008 г. по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 97/4.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 128 624,57 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости – 12 862,5 бел. руб.**

**Лот № 3.** Капитальное строение, здание магазина № 76, расположенное по адресу: Петриковский район, ст. Муляровка, инв. № 333/С-7185, общая площадь 156,0 кв. м, а/б покрытие инв. № 101025 (назначение – здание специализированное розничной торговли);
- капитальное строение здание склада, инв. № 333/С-7187, общая площадь 27,3 кв. м;
- капитальное строение – сооружение – железобетонный забор, инв. № 333/С-7186, общая площадь 27 кв. м;
**Лоту принадлежит оборудование:**
- система охранной сигнализации № 446603; кондиционер Haiper AC 482 AFFAA № 449036;
- надстройка для подиума двухуровневая ДСП 2800*100*1400 № 444143.
**Информация о земельном участке:** кадастровый номер 324300000001000777, площадью 0,0574 га.
(право постоянного пользования), по адресу: Петриковский район, ст. Муляровка, назначение для содержания и обслуживания магазина № 76.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 27 924,10 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости – 2 792,41 бел. руб.**

**Электронные торги состоятся 30.09.2020 на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by.**

1. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by
2. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
3. Последний день подачи заявлений – 29.09.2020.
4. Шаг аукциона – 5 % от начальной цены предмета торгов.
5. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат согласно прейскуранту торговой площадки в течении пяти календарных дней со дня проведения торгов.
6. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества.
7. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 6672143.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

